Смерць святара ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Ваенны час у Орлі ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 37 (2783) Год LIV | Беласток, 13 верасня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Расслаўляецца Збуч

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Археалагічны фэст „Гарадзішча" ў Збучы, ладжаным войтам і Гміннай управай культуры з Чыжоў і дзякуючы заангажаванню ў арганізацыю гэтага мерапрыемства людзей з Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства, а перад усім асабістаму дырэктара Дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны гэтай жа ўстановы Анатоля Вапа адбыўся 6 верасня. Паказваюцца на ім штодзённыя заняткі людзей пражываючых ад вякоў на сённяшніх тэрыторыях Гайнаўшчыны ці Бельшчыны і прэзентуецца наш неапрацаваны і апрацаваны фальклор. Аднак марай многіх наведвальнікаў гэтага фэсту было ўбачыць на ім беларускіх рыцараў і іншых людзей з беларускіх зямель апранутых у вопратку з сярэднявечча. На сёмы збуцкі археалагічны фэст былі запрошаны рыцары з брэсцкай групы „Die Stadt Elbing" і славутыя калектывы, стылізаваныя на сярэднявечча — „Стары Ольса" і „Бяседа".

Вялікае зацікаўленне сабраных выклікала рыцарскае змаганне

— Мы вельмі шкадуем, што не прыехалі рыцары з Беларусі, бо іх пабыўка была ўжо гарантаваная дэпартаментам культуры і нацыянальнай спадчыны, што фундаваў нам выступ вояў і многа іншага. Аказалася, што не атрымалі яны візаў, — сказала Іаанна Белавежац з Гміннага асяродка культуры ў Чыжах. У гэтым годзе вялі выступы на сцэне і прымалі гасцей дзеўкі і маладзіцы.

Спевы і танцы напаміналі аб нашым мінулым

Стаянкі паспяхова падрыхтаваныя на палях збуцкіх гаспадароў гусцелі ад машын, а пешаходы таксама хутка папаўнялі лік сабраных. Нягледзячы на ветранае надвор'е і ранейшае метэаралагічнае папярэджанне, што можа пайсці дождж, на археалагічны фэст прыехала многа так нашага народу, як і польскага насельніцтва, што цікавіцца гісторыяй. Мерапрыемства, наладжанае між іншым пад медыяльным патранажам нашага тыднёвіка „Ніва", распачалося з цікавых выступаў беларускіх калектываў з Чыжоўскай гміны — „Збучанак", „Чыжавян" і „Незабудак" з Курашава. Аднак па-свойму не толькі спявалася, але і гаварылася ў час сваёй імпрэзы. Народныя творцы прапанавалі купляць іх вырабы, расказвалі і паказвалі, як іх выконваецца. Можна было пакаштаваць мёд, розныя пірожныя вырабы і многа іншага яства, купіць харчы. Дзеткі гулялі ў парку гульняў, спецыяльна арганізаваным для наймалодшых. Дзеткі і моладзь прымалі ўдзел у конкурсах, выступалі перад публікай. Гайнаўскія белгімназісты, белліцэісты і вучні з гімназіі н-р 2, што пры Беларускім музеі ў Гайнаўцы займаюцца ў калектыве „Сявенька", удала выступілі з пастаноўкай „Вяселля". — Мы вясельную пастаноўку зрабілі на падставе абрадаў з Гайнаўшчыны. Выступалі з ёй і будзем выступаць на розных мерапрыемствах, — сказала мастацкі кіраўнік калектыва Юліта Такаюк.

Мастацкую праграму са спевамі і танцамі запрэзентавалі вучні з калектыву "Перапёлка" і „Студыі песні", што дзейнічаюць пры Гайнаўскім доме культуры. Побач мясцовых калектываў удала выступілі на фэсце таксама запрошаныя госці, калектыў „Каліна" з Залук, музычны калектыў „Нарва" з Нарвы і капэла з Сямятыч.

З „Вяселлем" цікава выступіў тэатральны калектыў „Сявенька", што ад нядаўна займаецца пры Беларускім музеі ў Гайнаўцы

Пераносіліся ў мінулае

Публіка з нецярплівасцю чакала выступаў калектываў з Рэспублікі Беларусь —„Стары Ольса" і „Бяседа", якім моцна апладзіравала пасля спеваў. Вельмі спадабаліся ўборы, спеў і танцы калектыву „Стары Ольса", якія пераносілі сабраных у сярэднявечча. Не хапала толькі беларускіх рыцараў. Рыцары з Польшчы раскладаліся са сваімі палаткамі пры насыпе, што акружае даўняе гарадзішча, якое некаторыя лічаць нават тысячагадовай даўнасці. На раскопках на гарадзішчы быў раскапаны між іншым насып у месцы дзе магла быць брама. Знайшлі там стоўб і шкілеты людзей, пахаваных недзе ў XVII стагоддзі. Звонку насыпу быў вялікі роў з вадой, які дапамагаў бараніцца ад захопнікаў, а ўсярэдзіне мог быць другі, якім магла адводзіцца вада з гарадзішча. Яшчэ раней былі знойдзены ў іншым месцы людскія шкілеты з XIV-XV стагоддзяў. Археолагі мяркуюць, што самое гарадзішча магло быць збудаванае нават у IX-X стагоддзях. Планавалася нават рэканструяваць браму і фрагмент насыпу з абарончай агароджай, аднак з-за недахопу сродкаў гэтая ідэя адтэрміноўваецца. Сёлета, так як і ў мінулых гадах, было вялікае зацікаўленне рыцарскімі змаганнямі. Рыцары прэзентавалі сваю цяжкую жалезную зброю, біліся. На жанчынах можна было ўбачыць вопратку рэканструяваную пад сярэднявечча. Можна было пазнаёміцца з дымаркамі, у якіх плавілі жалеза і прыгледзецца, як у кавальскай печы выкоўваліся з яго розныя вырабы. Некаторыя з іх яшчэ гадоў трыццаць таму выконваліся ў нашых сёлах. Можна было купіць керамічныя і ганчарскія вырабы, іконы, розную літаратуру, касеты і дыскі з рознай музыкай. Цікавымі былі таксама выступы польскіх коннікаў і конкурс кідання на адлегласць хамута. Мерапрыемства завяршылі выступы калектываў „Луна" з Парцава, „Ляйланд" з Беластока і „Тройка" з Гайнаўкі ў час традыцыйнай вясковай забавы.

Хто ваюе ☞ 2

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Даўно-даўно таму Чарльз Дарвін абнародаваў свету сваю тэорыю змагання за быт у прыродзе, а яшчэ да яго падобную тэорыю, толькі ў адносінах да чалавечых мазгоў, прыдумаў ягоны цёзка Клаўзевіц. І так вось, у згодзе з гэтымі тэорыямі ідзе ў свеце змаганне за рознае выжыванне.

Згодна Клаўзевіцу другая сусветная вайна ўспыхнула з хвілінай прымянення зброі дзеля дасягнення палітычных мэтаў, а значыць 1 верасня 1939 года, а пазней пайшло-пакацілася незалежна ад таго, хто якую дату лічыць пачаткам сваёй уласнай вайны...

Каб жыць дастойна ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

На акраіне Блудаўскай пушчы ☞ 5

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Зажалі і зжалі ☞ 9

Міра ЛУКША

Трэці „Wymiar" ☞ 10

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

9 770546 196000

Аграпарадак

Кожная наша ўлада заўсёды нешта абяцала. Калісьці Хрушчоў сцвярджаў, што СССР дагоніць і перагоніць ЗША па вытворчасці ўсяго. Брэжнеў казаў, што наша пакаленне будзе жыць пры камунізме. А Гарбачоў заяўляў, што да 2000 года кожны савецкі чалавек будзе мець асобную кватэру. Нашы асцярожныя людзі пасмейваліся з такіх абяцанак і не верылі ні слову. Як пазней высветлілася — правільна рабілі. Нічога з таго, што абяцалася — не атрымалася.

І добра, што не атрымалася — гэта не сама кепскі вынік і фінал. Горш за ўсё, калі абяцальнікам нешта ўдавалася зрабіць. Прыкладам, завяршыць у адпаведны тэрмін будаўніцтва Чарнобыльскай АЭС. Як высвятляецца, усё гэта пасля вельмі цяжка перарабіць і выправіць.

Таму мы, беларусы, заўсёды цешымся, калі ў нашага кіраўніцтва не атрымліваецца зрабіць тое, чым яны абяцалі нас ашчаслівіць. Не атрымалася „дзеля нашай карысці" аднавіць СССР — ну то і добра. Разбурыліся абяцанні рэабілітаваць былую сацыялістычную эканоміку — мы і за тое ўдзячныя лёсу. Так і не ўдалося стварыць „дзеля нашага дабрабыту" саюзную беларуска-расійскую дзяржаву — ну і дзякуй Богу. Хоць неяк, так-сяк, жывём, з горам папалам. А што было б, калі б усе гэтыя планы здзейсніліся? Аварыя на Чарнобыльскай АЭС тады здавалася б лёгкім аздараўляльным выпраменьваннем.

Зараз маем чарговыя абяцанкі будучага шчасця. Аказваецца, праз пяць гадоў, беларусы будуць жыць у аграгарадку. Так сам Прэзідэнт заявіў. Задума надзвычай амбіцыйная і па маштабнасці не саступае планам пабудовы камунізму, задумам перагнаць ЗША і жаданню падарыць кожнаму грамадзяніну ўласную кватэру. Але што такое аграгарадок, нам пакуль ніхто не растлумачыў.

Увогуле, слова „аграгарадок" няма ні ў адным слоўніку. Гэтае слова прыдуманае і ненатуральнае, як і сама з'ява. Гэта чарговая спроба не даць сялянам вырвацца з калгаснага (сінонім — прыгоннага) права. І хоць жаданне захаваць калгасны прымус хаваецца пад словы „праграма адраджэння вёскі", кожнаму зразумела, што не пра вёску размова. Бо нават у ключавым слове гэтай праграмы „аграгарадок" кораня з гучаннем „вёска" няма.

Аграгарадок — гэта калгас 21 стагоддзя. Там усё ясна і зразумела, як і ў калгасе 20 веку. Тыя ж самыя працадні, замест зарплаты, толькі з адным адрозненнем — нейкія дробныя грошы, дзеля выгляду, даюць. Яшчэ ставяць аднолькавыя, як у гулагу, платы, і будуюць аднолькавыя, як у аграгарадку, хаты.

Для свіней, праўда, у параўнанні з калгасам 20 стагоддзя, змены ёсць. Ім і новыя тэхналогіі па еўрапейскіх стандартах, і цёплыя будынкі і нават абслуга ў выглядзе ветэрынара з вышэйшай адукацыяй і вартавога з бутэлькай гарэлкі.

Для людзей — зменаў аніякіх. Ні свабоднай прэсы, ні незалежнага прафсаюза, ні школы на роднай мове. Для людзей еўрапейскія стандарты не падыходзяць. Чалавек у аграгарадку — усяго толькі абслуга свіней або запчастка для трактара. Гэта трактарныя электронныя мазгі, якія нашы канструктары не змаглі замяніць электронікай не біялагічнага паходжання. Калі захварэе свіння або паломіцца трактар, то чалавек будзе мець праблемы. Калі ж захварэе чалавек, то ні свіння, ні трактар, ні кіраўніцтва калгасу, раёна і дзяржавы гэтага проста не заўважаць. Чалавек у аграгарадку мае нейкую вартасць, але не першасную. Першасную вартасць для эканомікі краіны і для ўсеагульнага шчасця і дабрабыту маюць свінні, трактары, хлеб і бульба. А чалавек — гэта ўсяго толькі другі хлеб, другая бульба, другі трактар, другая свіння. Такі там парадак. Аграпарадак.

А праз пяць гадоў, кажуць, мы ўсе будзем жыць у аграгарадку. Прынамсі, так абяцаюць. Або палохаюць. Толькі нашы людзі не баяцца. Бо маюць багаты гістарычны вопыт на ўзроўні генетычнай памяці. Спадзяюцца, што і гэтыя планы па ператварэнні нашай Радзімы ў аграгарадок ляснуцца гэтак жа, як і абяцанні ашчаслівіць нас камунізмам, саюзнай дзяржавай і аднаўленнем СССР.

У адваротным выпадку нашым нашчадкам сапраўды прыйдзецца выконваць „праграму па адраджэнню вёскі" — ратаваць вёску і Бацькаўшчыну ад аграгарадкоў.

Віктар САЗОНАЎ

Хто ваюе

Даўно-даўно таму Чарльз Дарвін абнародаваў свету сваю тэорыю змагання за быт у прыродзе, а яшчэ да яго падобную тэорыю, толькі ў адносінах да чалавечых мазгоў, прыдумаў ягоны цёзка Клаўзевіц. І так вось, у згодзе з гэтымі тэорыямі ідзе ў свеце змаганне за рознае выжыванне.

Згодна Клаўзевіцу другая сусветная вайна ўспыхнула з хвілінай прымянення зброі дзеля дасягнення палітычных мэтаў, а значыць 1 верасня 1939 года, а пазней пайшло-пакацілася незалежна ад таго, хто якую дату лічыць пачаткам сваёй уласнай вайны. Другая сусветная вайна закончылася недзе каля 1945 года; калі дакладна — гэта розныя яе суб'екты вызначаюць па-рознаму.

Праўду кажучы, тая вайна, аднак, хіба яшчэ ўсё ж такі і не закончылася, бо адбываецца сям-там заўзятае змаганне вакол яе. Прыкладам такога змагання было нядаўнае адзначэнне сямідзесятай гадавіны яе выбуху, якое адбылося ў Гданьску, дзе галоўнымі пеўнямі выступілі Масква і Варшава. І змаганне гэтае, так мне бачыцца, адбываецца на крыху іншым фронце, чым гэта на першы погляд выглядае.

Як бы ні глядзець на фізіялогію маскоўскай дзяржавы, яе аўтарытарныя ўладары ўвесь час намагаюцца паказвацца перад сваім насельніцтвам у ролі карпатлівых бацейкаў, якія толькі і думаюць пра ашчасліўленне свайго народа. Бо нават у Масковіі, калі які няўмелы ўладар страціць станоўчы імідж, тады марны яго лёс; крышку прыкладам удалося ўжо здарыцца. Таму крамлёўскія рулявыя пастаянна працуюць на сваю славу то праводзячы халодную вайну „на благо" свайго насельніцтва, то і гарачую. Вось у бальшавіцкі час вельмі заўзята яны змагаліся менавіта з „ворагамі народа" — усялякімі трацкістамі, зіноўеўцамі, бухарынцамі, шпіёнамі... Цяпер настала там мода змагацца з „фальсіфікатарамі" гісторыі, так унутранымі як і вонкавымі. І гэтым змаганнем займаюцца не толькі генеральскія чыны, але і яшчэ і важнейшыя ад іх дзяржаўныя фігуры з прэм'ерам і прэзідэнтам на перадавой.

Вельмі цікава, што тое змаганне з „фальшаваннем" маскоўскай гісторыі не закранае ўстанаўлення некаторых гістарычных фактаў. Дагэтуль, для прыкладу, ніхто нідзе не ведае, колькі дакладна насельніцтва пражывала ў межах маскоўскай дзяржавы да вайны і пасля яе, і колькі таго насельніцтва стала ахвярай „победы". Гэтым пытаннем маскоўскія чыны галавы не дураць ні сабе, ні сваім падуладным, яны ж увесь час змагаюцца за „народнае шчасце".

Такіх багатых героямі народаў больш. Гэтыя народы можна было акрэсліць і на згаданым мерапрыемстве ў Гданьску на падставе рангу прысланых туды прадстаўнікоў. „Негеройскія" дзяржавы прыслалі чыноўнікаў рэлятыўна невысокага рангу, затое „нашы" выступілі у цэлы свой геройскі рост, асабліва расійскі прэм'ер і наш польскі прэзідэнт...

Бо хаця ў Польшчы пра аўтарытарнасць гаварыць не прыходзіцца, аднак нашы ўладары вельмі любяць паказвацца ў геройскім арэоле ў нейкім змаганні за народнае шчасце. Прыкладам таму было цалкам нядаўняе люстрацыйнае наступленне нашых вярхоў на рознамасных мясцовых „ворагаў народа", толькі — здаецца — без шуфлядавання іх на „эсэраў", „трацкістаў" ці „белагвардзейцаў". І яшчэ адно адрозненне: у Масковіі змаганне адбывалася з дапамогай свінцовых сродкаў, у нас жа гэта па сутнасці *paintball*. Пры нагодзе — здаецца мне, што і ў нашай Найяснейшай не надта вядома, колькі народу загінула ў выніку Варшаўскага паўстання...

Вярнуся зноў у маскоўскае старонне, каб больш дэталёва прыгледзецца аб'яўленаму тамашнімі законамі змаганню з „фальсіфікацыяй" гісторыі другой сусветнай вайны. Вось ад яе тамашняга выбуху, ад чэрвеня 1941 года, Масква ўвесь час пераможна ваюе з фашызмам і сумняваецца ў гэтай перамозе забараняюць новыя тамашнія законы. Бо засумняваецца можна, асабліва калі прыгледзецца цяперашняму там парадку. Мы, тут у Польшчы, асабліва ж у нашым тутэйшым куточку, любім з'едлівенька пасмяяцца з нашай варшаўкі, што там тыя нашы партыі адно грызуцца паміж сабою. Нейкі час было так і ў Расіі, але цяпер там усталёўваецца лад і парадак. Уладу ў Крамлі трымае цвёрда партыя Единая Россия. Калі б, аднак, тую „единую" расчляніць на дэталі і перакласці іх на нямецкую мову, атрымаецца крыху на свой лад праслаўленая фраза: *Ein Land, ein Volk, ein Führer*...

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Пры нагодзе гадавіны

Пры нагодзе гадавіны выбуху II сусветнай вайны трапіў я на выстаўку здымкаў пад беластоцкім Музеем войска, якую сарганізавалі пад лозунгам „1 верасня ў паўночна-ўсходнім рэгіёне". Я ведаў, што нямецкія войскі ў 1939 г. увайшлі ў Беласток 15 верасня. Паміж першым і якраз паловай верасня стаў ён важным асяродкам бежанства з заходніх тэрыторый Польшчы, якія заваёўвалі гітлераўцы; асабліва ўцякалі сюды яўрэі (у самім горадзе да вайны былі яны меншасцю налічваючай аж 42% жыхароў; параўнальна — беларусаў тут было 0,5%). Я хацеў пабачыць на выставе, як выглядаў у той час Беласток і асабліва паўднёвая частка рэгіёна з Гайнаўкай, Бельскам-Падляшскім ці Сямятычамі, а нават і Гродна, бо ж да вайны яно ляжала ў адміністрацыйных межах Беластоцкага ваяводства. Разлічваў таксама на нейкія здымкі, інфармацыі аб Беларускім саюзе студэнтаў, якога члены ў той час — як напісаў адзін з гісторыкаў у сваёй кніжцы — „увайшлі ў склад нацыянальнага актыву". Нічога такога не знайшоў. Іканаграфічных матэрыялаў непасрэдна звязаных з непасрэднай тэматыкай выставы было вельмі мала. Затое шмат з часу пасля 17 верасня, значыць, з часу, калі наш паўночна-ўсходні рэгіён апынуўся пад саветамі. Адзіным матывам звязаным проста з лозунгам экспазіцыі былі ілюстрацыі датычныя першых ваенных дзеянняў з тэрыторыі былога Ломжынскага ваяводства: Візны, Навагроду.... Шмат фатаграфій было ўжо паказаных неаднойчы, як тая з савецкімі салдатамі пад палацам Браніцкіх, на якім павіс агромны партрэт Восіпа Сталіна. Я меў уражанне, што дырэкцыя Музея войска зрабіла гэтую экспазіцыю наспех; яна мусіла ж згодна са сваімі статутнымі запісамі „штосьці" сарганізаваць, тым больш таму, што адзначэнням 70 гадавіны выбуху вайны надалі ва ўсёй краіне вялікі размах.

Паглядзеўшы гэтую выстаўку, трапіў я на два цікавыя артыкулы звязаныя з выбухам вайны: адзін у мінскай „Нашай ніве", другі ў шаноўным „*Tygodniku Powszechnym*". У першай газеце я прачытаў: „1 верасня вайна пачалася для шматлікіх беларусаў, што служылі ў польскім войску. Прыкладам можа служыць лёс Народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля. Ён удзельнічаў у баях польскай арміі на Вэстэрплятэ, у самым пекле". У сваю чаргу ў „*Tygodniku*" паэт і пісьменнік Валянцін Тарас (год нараджэння 1930) у інтэрв'ю заявіў: „Янка Брыль абараняў Вэстэрплятэ і як ветэран атрымліваў падтрымку з Польшчы". Прачытаўшы тыя інфармацыі я ў рэдакцыі аж крыкнуў: „Такі вялікі пісьменнік, Янка Брыль! Такая гераічная бітва, Вэстэрплятэ!" На зямлю аднак сцягнула мяне мая рэдакцыйная каляжанка Міра Лукша:

— Калі я размаўляла з Янкам Брылем, ён прызнаўся, што сапраўды змагаўся ў польскай арміі ў вераснёўскай кампаніі, але абараняў Гдыню. Пасля трапіў у палон.

А мне ўжо так „прыгожа" складвалася: Брыль, герой з-пад Вэстэрплятэ!

Дакапаўся я да аднаго з выказванняў гэтага пісьменніка, якога няма ўжо ў жывых. Сам прызнаўся: „У войску мне прыйшлося служыць толькі паўгода, але ў дзвюх розных часцях (другі батальён марской пяхоты ў Гдыні і, два месяцы, 7 полк пяхоты легіёнаў у Хэлме-Любэльскім)...". Так ці інакш, Янка Брыль унёс частку самога сябе ў тое, што Польшча была першай краінай, якая супрацьставілася фашыстам. І бачыцца гэтага каштоўнасць. На чатыры дні да гадавіны выбуху вайны Гарадская рада ў Гдыні (з ініцыятывы Таварыства „Хатка") прыняла пастанову аб наданні яго імя адной з дванаццаці новых вуліц, у новым раёне горада.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Пытанні без адказаў

Гутарка з Аркадзем Панасюком, аўтарам кніжкі „Wśród nocnej ciszy”

„Ніва”: — *Таямніца смерці айца Пятра Паплаўскага, які да 1985 быў настаяцелем прыхода ў Нарве, да сёння нявысветлена. Чаму Вы якраз гэтым заняліся?*

Аркадзь Панасюк: — Я выпадкова трапіў на гэтую гісторыю. У маіх руках апынулася кніжнае выданне „рапарту Ракіты”, без дадаткаў. Гэта плён працы следчай камісіі з 1989-91 гадоў, якая займалася нявысветленымі сконамі за час ваеннага становішча ажно да 1989 года. І там я знайшоў прозвішча айца Пятра Паплаўскага. Пачуў такі *флэшбэк*. Калі быў вучнем ліцэя, шмат пра тое гаварылася, у хаце, з суседзямі, я меў калегу з Нарвы, які пра гэта распавядаў. Хваляваліся гэтай сітуацыяй, нават не таму, што былі вернікамі, якія шмат практыкуюць, але гэта было жахлівае ды яшчэ пару месяцаў пасля торуньскага працэсу, у якім прыгаварылі забойцаў ксяндза Папялушкі. Я тады пісаў у школьнай газеце „Складоўшчак”. Нават думаў неяк узяцца за гэтую тэму, але тады не было на гэта ні магчымасці, ні шанцаў. Гэтая справа вярнулася ў 2007 годзе і я падумаў, чаму б не, тым больш, што справа датычыць чалавека з маёй традыцыі, духоўнага. У „рапарце Ракіты” не надрукавалі дадаткаў, яны знаходзяцца ў сеймавым архіве, я падаў заяву і атрымаў гэты дадатак. Аднак, аказалася, што гэта паўтара ліста сенсацыйнага матэрыялу, які паказвае перад усім памылкі ў следстве. Я як першы пачаў працу над гэтым у такім маштабе, усё працягвалася з лютага 2007 практычна да снежня 2008 года: збіранне матэрыялаў, размовы з людзьмі, духоўнымі, сям'ёй, міліцыянтамі, са службоўцамі бяспекі.

— Як выглядалі гэтыя сустрэчы?

— Я дазваляў сябе трактаваць як наіўнага чалавека. Калі сустракаўся, напрыклад, з маёрам Цудоўскім, не маглі дзесьці прысесці, трэба нам было зысці ў нейкія падвалы. „Абсалютна нічога не запісвайце, мы — прафесіяналы”, „Мы легалісты, а не нейкі ордэн, калі нешта было кепска праведзена, за ўсё адкажам”. Як у фільме, часам мяне нават смяшылі тыя размовы! Але бывала, што нешта мне пацвярджалі, немагчыма, каб бачылі дакументы, якімі я карыстаўся. Былі і сустрэчы нечаканыя. Адбыў размову з бацюшкам старэйшай даты, і ён у мяне пытаецца: „Як думаеце, што гэта магло быць?”, „Як што — або забойства, або самагубства”, а ён: „А калі б быў трэці варыянт?”. Таямніча зірнуў і працягнуў: „Ёсць нешта такое як таямніца споведзі...”. І пакінуў мяне з гэтай адкрытай картай. Не адзін раз задумваюся, што ён хацеў мне сказаць. А каноны абысці немагчыма.

— Як сабе ўявіць трэці варыянт?

— Можа, нейкая спрэчка, бойка і выпадковая смерць. У крыві пакойнага быў алкаголь. Можа дзесьці выпівалі і так нешчасліва завяршылася. Анатаміраванне трупа магло б шмат расказаць, але вядома, што пратаколы былі „адпаведна” напісаны. У гэты момант я не ведаю як было. Тут цікавыя два матывы. Што з бацюшкам адбывалася з 15 чэрвеня 1985 года, калі айцец загінуў, да 21 чэрвеня, калі ён быў знойдзены ў лесе. А другая справа гэта ўсё, што вакол справы рабіла МУС. Можна дадумвацца, што нікому не залежала на тым, каб высвятліць гэтую справу, зразумела, па розных прычынах. Я бачыў здымкі з агляду месца здарэння, з пракурорскіх актаў і мушу прызнацца, што для мяне гэтае самагубства падазронае. Маеш уражанне, што гэтая асоба была падвешаная, нават пятля не была зашморгнута. Але гэта мае адчуцці, можа, я быў вельмі ўсхваляваны. Але падобныя ўражанні ў мноства іншых асоб, якія пра справу ведалі. Іх прозвішчы паяўляюцца ў кніжцы. А іх нават не дапытвалі.

— Некаторых гэты матэрыял можа шакіраваць, бо раскрываеце таксама промысел азарта сярод духоўных.

— Гэта сакрэт палішынеля, што на рымска-каталіцкай парафіі ў Заблудаве адбываліся сустрэчы „пры картах”, пры азарце, пры чарцы. Я так сабе думаю, што там маглі сустракацца ўплывовыя асобы, духоўныя, міліцыянты. Можа там нават здарыўся нешчаслівы выпадак і хтосьці быў у змозе сімуляваць самагубства... Можа нават гэта і было самагубства, але танец наўкол гэтай справы прымушае задумацца. Вырашальнікі не хацелі, каб з'явіўся чарговы мучанік, нават калі не меў такой біяграфіі як ксёндз Папялушка, таму што проста ўсчалася б завіруха.

— А як ацэньваеце пазіцыю духоўных у гэтым кантэксце?

— Трэба бачыць усю складанасць сітуацыі. Калі давалі мне матэрыялы ў ІНП пра айца Паплаўскага, зразу сказалі: тайны супрацоўнік! Але, як аказалася, гэта не такі адназначны выпадак. А прыклад мітрапаліта Васілія? Прыпарадкавалі яму пару літарак, але нідзе не напісана, што пасля смерці айца Паплаўскага ён стараўся знайсці кватэру для яго сям'і. Ніколі не напісаў бы я такой кніжкі як ІНП. Кваліфікаваць кагосьці толькі і выключна на аснове эсбэцкіх папер гэта проста рабіць крыўду. Чацвёртыя аддзелы ІНП, што займаліся духоўнымі, былі вельмі спецыфічнымі; духоўнікаў прынцыпова рэгістравалі як тайных супрацоўнікаў, але ўсё трэба праверыць, сканфрантаваць з абвінавачанай асобай, а не адразу выносіць на свет.

— Ці быў момант, калі Вы засумняваліся ў поспеху гэтай працы?

— Не, знайшлося крыху дакументаў і я падумаў, што нават калі размовы нічога не прынясуць, засяродзіўся б на матэрыялах. Затое былі ананімныя тэлефоны. Званілі і гаварылі нават наўпрост, каб я кінуў гэтую тэму. Ведаю, што кружылі асобы, якія асцерагалі іншых, каб са мной не гутарылі. Або такі тэлефон: „А вы не ведаеце, што бацюшка злоўжываў алкаголь? Не меў добрай апініі”. Але для мяне гэта не мае значэння. А можа на хвіліну перад смерцю выспавядаўся і адышоў з чыстым сумленнем?..

— Адкрываеце толькі праўду смерці, ці мо за гэтым стаіць штосьці больш?

— Калі частка матэрыялу была надрукавана ў „Кур'еры паранным”, пазваніла мне з вялікім жалем жонка аднаго з мужчын, якога прозвішча я прыгадаў. Яна прыходзіла і палохала мяне працэсамі. Я стараўся ёй патлумачыць механізмы тых часоў, аператыўную дзейнасць, як распускалі чуткі. Можа гэта не дакладна яе муж рабіў спіскі людзей, а „эсбэкі”, але нехта мусіў „быць адказны” за гэта. Людзі тады не мелі такіх ведаў як мы сёння. А час быў сапраўды страшны. Важна, каб пра гэта расказваць.

— Якім чынам удалося Вам выдаць гэтую кніжку?

— Знайшліся спонсары, асобы, якія заняліся наборам кніжкі, вокладкай, але не хочуць выступаць пад сапраўднымі прозвішчамі. Дарэчы, такім выданнем павінны пацікавіцца выдавецтвы царкоўныя, беларускія, я нават такім шляхам пайшоў і быў шакіраваны. Казалі: класна, але хацелі толькі прачытаць рукапіс, я сказаў бы, што гэта „бяспечніцкія” метады. Але з'явіліся і каментары такога роду: „Гэта пашкодзіць Царкве”, „Гэта пашкодзіць праваслаўна-каталіцкім адносінам” або „Заслаба б'еш у Царкву”. Як мне гэта асэнсаваць? Я нават хацеў двухмоўную кніжку, польска-беларускую, гэта ж гісторыя чалавека з меншасці, ці праваслаўнай, ці беларускай. Каб напісаў пра вясковыя традыцыі, напэўна, знайшліся б грошы. Выйшла 500 экземпляраў, але будуць яны даступныя бясплатна на аўтарскіх сустрэчах, якія плануюцца ў Нарве, Гайнаўцы (11 верасня ў Гарадской бібліятэцы), можа ў Беластоку. На гэтым этапе справа для мяне закрытая, але паціху маю надзею, што можа аўтарскія сустрэчы прыцягнуць нейкіх людзей, можа навядуць на новыя сляды. Я працёр шлях, а далей павінны займацца гэтым іншыя, скажам, меншасныя журналісты ці выданні.

— А якое было стаўленне сям'і бацюшкі Пятра?

— Спачатку не давяралі мне, але гэта зразумела, бо можа я, як і раней радыёжурналісты, прыехаў зрабіць сенсацыю. Але мне пашанцавала. Я вёў сябе стрымана, яны таксама. Але кніжку прачыталі, падзякавалі. Ведаю, што так па-людску хацелі б спазнаць праўду.

Калі хто з чытачоў можа дапамагчы разгадаць тайну гэтай засакрэчанай падзеі, буду ўдзячны за адгалоску ў рэдакцыю або мне асабіста на адрас [arka3@poczta.onet.eu].

— Дзякуем за размову.

Размаўляла Ілона КАРПЮК

Фота Ілоны КАРПЮК

Аркадзь Панасюк *— нар.6.01.1967 года ў Беластоку. Русіст, журналіст. У газеце дэбютаваў у 1982 годзе сатырычным рысункам. Выпускнік Агульнаадукацыйнага ліцэя імя М. Складоўскай-Кюры ў Гайнаўцы. Як вучань Культурна-асветніцкай установы ў Цеханове ў 1987 пачаў працаваць музычным журналістам. Працаваў у цэнтрах культуры, настаўнічаў, быў журналісцкім валанцёрам, пісаў пра войска, паліцыю, палітыку. Дзесяць гадоў жыў і працаваў у Варшаве. Ад двух гадоў з сям'ёй жыве ў Гайнаўцы, з'яўляецца журналістам Гайнаўскага дадатка „Кур'ера параннага”.*

Супрацоўніцтва працягваецца...

Павятовае староства ў Сямятычах ужо чацвёрты год запар сардэчна запрасіла дэлегацыю з Камянецкага раёна да ўдзелу ў Міжнародных таргах прыгранічча. Камянецкі раён на IV Міжнародных таргах прыгранічча прадстаўляла дэлегацыя ад Высокаўскага цэнтра пазашкольнай работы ў складзе 23 чалавек. Гэта былі члены ўзорнага клуба аматараў фальклору „Катрынка" і члены Камянецкага раённага культурна-асветніцкага аб'яднання „Спадчына".

Таргі арганізоўвае Сямятыцкі кансорцыум па гаспадарчых пытаннях сумесна з павятовым і гарадскім самаўрадамі. Мэтай мерапрыемства з'яўляецца эканамічны пад'ём Сямятыцкага рэгіёна, а таксама ўстанаўленне блізкага супрацоўніцтва з гаспадарчымі суб'ектамі суседніх дзяржаў, у тым ліку і Беларусі. У гэтым годзе на таргах свой тавар прадставілі малыя і сярэднія фірмы з розным напрамкам дзейнасці. У таргах удзельнічала 90 фірм.

Наша дэлегацыя прадставіла на таргах работы гурткоўцаў Высокаўскага цэнтра пазашкольнай работы: малюнкі, вышыўку, выпільванне і выпальванне на дрэве і г.д.

Члены ўзорнага клуба аматараў фальклору „Катрынка" Высокаўскага цэнтра пазашкольнай работы і члены Камянецкага раённага культурна-асветніцкага аб'яднання „Спадчына" далі два канцэрты: 22 жніўня ў Сямятыцкім доме культуры і 23 жніўня на пляцоўцы таргоў.

Павятовае староства арганізавала для нас катанне на параходзе па рацэ Буг, экскурсію па горадзе Драгічын, адпачынак у Чартаеве. Вялікае дзякуй пану старосту Яну Залеўскаму і нашай апякунцы — пані Анне Бярэзе.

Старшыня Камянецкага раённага культурна-асветніцкага аб'яднання „Спадчына"
Людміла ДУДАР

Нараўчанская гміна

Найпрыгажэйшыя сялянскія сядзібы

Нядаўна камісія, якую састаўлялі радныя Ян Целушэцкі, Крыстына Кіслая, Міраслаў Краснапольскі і Ян Сухадола, падвяла вынікі конкурсу на „Найпрыгажэйшыя сялянскія сядзібы 2009 года" ў Нараўчанскай гміне Гайнаўскага павета. У ім удзельнічалі 16 гаспадароў з Альхоўкі, Міклашэва, Мінкоўкі, Плянты, Семяноўкі, Скупава, Смольніцы, Свінарояў, Тарнопаля і Заблотчыны. Усе яны атрымалі дыпломы і грашовыя ўзнагароды.

У катэгорыі „сялянская сядзіба" ўзнагароды за першае месца атрымалі Галіна і Ірэна Бяглюк з Мінкоўкі, за другое раўнапраўнае месца — Таіса і Ян Драўноўскія з Міклашэва ды Галіна Бірыцкая з Плянты, а за трэцяе — Анна Ігнатовіч з Семяноўкі.

У катэгорыі „пярэдняя частка сялянскага двара — дом і агародчыкі" першае раўнапраўнае месца занялі Міраслава Бортнік са Свінарояў, Люба і Лявон Кардашы з Тарнопаля і Галіна Вяжхоўская з Заблотчыны, другое месца — Галіна і Славамір Хвойка з Пасек, а трэцяе месца — Барбара Бяляўская з Янова.

Вылучэнні атрымалі Бажэна Болтрык і Уля Болтрык са Смольніцы, Міхал Лукша з Альхоўкі, Крыстына Бельская і Валянціна Янель з Тарнопаля, Валянціна і Віктар Германюкі са Скупава ды Ніна Валкавыцкая з Заблотчыны. **(яц)**

Каб жыць дастойна

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У час нядаўных святкаванняў у гонар Успення Багародзіцы нашыя вернікі прыносілі ў цэрквы збожжа (а ў гэтым ліку і авёс) для яго асвячэння, а прыходзяць з ім таксама на розныя мерапрыемствы. Многія жыхары нашых сёл лічаць недапушчальным карыстацца несапсаваным збожжам, як палівам для абагравання кватэр і дамоў

Нашы гаспадары і вясковыя пенсіянеры апошнім часам часта размаўляюць пра нізкія цэны сельскагаспадарчых прадуктаў, шукаючы віноўных такіх абставін. Сапраўды, цэны малака (плацяць для малых вытворцаў па 45-60 грошай за літр), ці збожжа (прапануецца куплю тоны аўса ўжо нават за 150 злотых, а тоны жыта за 180 злотых) дайшлі да такога нізкага ўзроўню, якога яшчэ хіба ў XXI стагоддзі ўвогуле не было. Адно даплаты да абробленых палёў даюць для многіх гаспадароў крыху сродкаў на ўтрыманне іх сямействаў. Цяпер у асноўным земляробы стрымліваюцца з продажам вельмі таннага збожжа, бо калі б гэтага не зрабілі, з сёлетняй рэнтабельнасцю былі б на вялікім мінусе. Затое не могуць стрымлівацца земляробы з продажам малака, бо мусілі б яго выліваць. Нават дакормліванне малаком свіней, без адпаведнай падрыхтоўкі малака, з'яўляецца пагрозай для здароўя і жыцця жывёл. Некаторыя гаспадары пачалі нават гадаваць быдлячы маладняк з выкарыстаннем малака, але гэта не вырашыць праблем з прыбытковасцю яго прадукцыі.

Трагедыя з многімі цэнамі сельскагаспадарчых прадуктаў

— Зараз трагедыя з цэнамі сельскагаспадарчых прадуктаў, і я не ведаю, адкуль узялася надпрадукцыя збожжа. Я размаўляў з самымі вялікімі выворцамі збожжа ў нашым рэгіёне і ўсе кажуць, што сёлета ўраджай меншы, чым быў летась. У нас, напрыклад, якасць збожжа добрая, бо вазілі яго і правяралі, але зерне драбнейшае і гэта прычына горшага плёну, — заяўляе Ян Адамчук з Чыжоў, які разам з сынамі з'яўляецца адным з большых пастаўшчыкоў збожжа ў Чыжоўскай гміне. — Калі не павышацца цэны збожжа, будзе дрэнна. Мы ссыпалі ўсё збожжа і чакаем лепшых цэн, але невядома, як з гэтым будзе.

У Чыжах, дзе прадукуецца многа збожжа, дыскусіі на тэму нізкіх цэн сельскагаспадарчых прадуктаў асабліва бурлівыя. Людзі шукаюць віноўных ва ўладах, гандлі і далей, у Еўрасаюзе.

— Нашыя гаспадары хвалююцца нізкімі цэнамі. Зыйдуцца, паразмаўляюць, панаракаюць, разрадзяць свае эмоцыі, і разыдуцца. А як было, так і ёсць, — кажа чыжоўскі сольтыс Андрэй Ціханюк. — Нашы гаспадары захоўваюць яшчэ па 20-30 тон збожжа з мінулага года. Не прадалі яго, бо думалі, што перад жнівом збожжа падаражэе, а тут маеш, — яно стала яшчэ таннейшым. Плацяць жа зараз толькі па 15 злотых за цэнтнер аўса і па 18 злотых за цэнтнер жыта. У гарадах работнікі кажуць, што гаспадарам добра жывецца, бо атрымліваюць яны даплаты. Тады няхай прыйдзе такі з горада і пагадуе кароў, калі за малако плацяць толькі больш за 50 горшаў за літр.

— Да чаго ж гэта падобнае, каб малако і збожжа былі такімі таннымі! Аднак у гаспадарцы грошы патрэбныя і нашыя людзі з Беразова прадаюць збожжа нават і танна, — кажа Рыгор Мароз са Старога Беразова, дзе прадукцыя збожжа, таксама на якасных землях, можа нават і большая, чым у Чыжах. — Гэта проста эксплуатацыя нашых земляробаў, якія злуюцца, што ў гандлі зарабляюць на іх так многа.

— Калісь, калі таннелі сельскагаспадарчыя прадукты, забастоўкі рабілі, а цяпер і не бастуюць, — дадае спадар Адамчук. Затое знерваваныя прадстаўнікі сельскагаспадарчага асяроддзя рашыліся дабівацца сваіх правоў законнымі метадамі (маючы на ўвазе ранейшыя незаконныя забастоўкі). Выйшлі яны з некалькімі ідэямі, якія мелі б давесці да росту цэн на прадукцыю з вёсак.

Ці шануем наша збожжа?

З дапамогай сельскагаспадарчым вытворцам прыйшлі таксама гарадскія менэджары, але іх ідэі не спадабаліся многім земляробам з Польшчы. Менавіта нядаўна паявіліся прапановы, каб пшаніцу і іншае збожжа, якое зараз вельмі таннае, выкарыстаць у вялікіх кацельнях, прыстасаваных да разнароднага паліва, як сыравіну для абагравання кватэр, дамоў і ўсялякіх устаноў. Прыхільнікі такога рашэння тлумачаць, што абагравание збожжам будзе нават таннейшым, чым дарагім цяпер вугалем, а паменшанне запасаў рознага зерня можа спрычыніцца таксама да павышэння цаны збожжа.

— Ужо ў мінулых гадах авёс пачала купляць вялікая беластоцкая электракацельня і карыстацца ім для абагравання горада. Аднак людзі зашумелі, што гэта грэх і немаральныя паводзіны, і яны сталі купляць толькі папсаванае збожжа. Зараз, каб завезці туды авёс для продажу, трэба каб ён быў крыху папсаваны і непрыемна пах. Калі авёс будзе якасным, яго не купяць, — інфармуе спадар Ян Адамчук. — Два гады назад ездзіў па Чыжах жыхар Гайнаўкі, які купляў тады авёс і плаціў за яго прыблізна больш за 400 злотых за тону. Запрашаў ён у сваё прадпрыемства, якое вырабляе печы для абагравання дамоў і гаварыў, што ёсць у іх прапанове печы прыстасаваныя да абагравання аўсом, з адпаведным падатчыкам для яго.

— Я здзівіўся, калі мне сказалі, што ў Дубінах ёсць асобы, якія абагруваюць свае прыватныя дамы аўсом. Але ў мінулым годзе чалавек з Дубін сказаў мне, што і ён гэта робіць. Гаварыў, што прынясе „вянглярку" аўса, выкіне яго ў печ і нават жар з яго доўга трымаецца, — тлумачыць спадар Андрэй Ціханюк. — Ужо ў мінулым годзе вугаль быў дарагім, бо тона яго каштавала 650-670 злотых, а пры гэтым многа ў ім было яшчэ і камення. Тона больш якаснага вугалю каштавала нават 800 злотых.

Нашы дзяды і бацькі вучылі нас шанаваць не толькі хлеб, які з'яўляецца сімвалам нашага харчавання, але ўсю іншую людскую ежу і ўсялякі быдлячы корм, каб не сапсаваліся яны перад выкарыстаннем. Калі гарадскія спецыялісты прапануючы абагравание збожжам звяртаюць галоўную ўвагу на эканомію, у многіх вясковых людзей, таксама і нашых з Бельшчыны ці Гайнаўшчыны, выклікае гэта абурэнне.

— Збожжа і хлеб лічаць яшчэ ў нас святасцю і я думаю, што нашы людзі не вырашацца на абагравание ім дамоў, — кажа спадар Рыгор Мароз з Беразова.

Хлеб надалей лічым мы сімвалам нашага дастатняга жыцця. У нашых цэрквах асвячаем яго ў час розных свят, а іншыя вырабы з мукі выкарыстоўваюцца ў час праваслаўных і каталіцкіх богаслужэнняў у рознай постаці. Хлебам і соллю вітаюць між іншым наважонаў і гаспадароў дажынак, якія завяршаюць збор збожжа. Нас вучылі таксама падымаць з зямлі хлеб і абцершы яго з'есці, а не выкідаць. Хаця ў гарадах здаралася пры народнай уладзе і здараецца цяпер, што сухі хлеб людзі выкідалі і выкідаюць на сметнік, то гэтыя паводзіны вельмі крытыкуюцца нашымі вясковымі людзьмі. Нашы выхадцы з сёлаў часта збіраюць засохлыя кавалкі розных пшанічных ці жытніх хлябоў і потым вывозяць іх на вёскі да сямейнікаў або да знаёмых, якія гадуюць свіней ці курэй.

— З пункту гледжання праваслаўнага веравызнання выкарыстанне збожжа да абагравання дамоў — недапушчальнае. Наша традыцыя таксама не дазваляе карыстацца збожжам як палівам. Праблемы маральнай натуры паяўляюцца таксама ў час генетычнай мадыфікацыі раслін, як і падчас прадукцыі біяпаліваў, — заяўляе мітрафорны протаіерэй Рыгор Сасна з Рыбалаў, у якіх асабліва ўшаноўваецца збожжа і хлеб у час штогод арганізаваных дажынак. Хаця авёс гэта не жыта ці пшаніца, з якіх пякуцца хлябы, дык і з аўса можна рыхтаваць рознае харчаванне, як рабілі гэта нашыя продкі. Ведаем хаця б старадаўнія стравы — аўсянку ці кісель.

(працяг у наступным нумары)

На акраіне Блудаўскай пушчы

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

У Рудніцу вядуць толькі лясныя дарогі. Іду па такой ад Баранавіцкай шашы, ад асфальтоўкі, што адыходзіць у Жэдню. Лес навокал салідны, высокі, стройны, спачатку бор, які перад Рудніцай пераходзіць у алешнік. Баравыя сосны і елкі выглядаюць быццам шматступенчатыя ракеты, якія з ходам пераадольвання часапрасторы губляюць непатрэбныя ступені; гэтак жа і дрэвы пакідаюць ніжэйшыя голлі, якія апынуўшыся ў цянёчку не даюць ужо ствалу патрэбнай для далейшага росту энергіі. І тое пакінутае на ствалах голле таксама ўтварае своеасаблівы ланшафт, які таксама нагадвае лес, адно такі, які пакідае пасля сябе буралом.

Капліца з крыжамі ў Рудніцы

Ландшафт ліставага лесу прыводзіць іншыя асацыяцыі. Нагадвае ён памяшканне, памаляванае рознай інтэнсіўнасці зялёнымі плямамі... Лес даходзіць да ракі Плоскі, зараз за якой і вёсачка Рудніца. У пойме ракі побач дарогі распасціраецца абшырны палетак буйной крапівы. За крапівой запушчаная сенажаць.

Сама вёска Рудніца ўжо на пенсіі, панадворкі выстрыжаны касілкамі. Спатканы мною мужчына аказваецца так негаваркім, што ў прынцыпе нічога ад яго не ўдаецца мне даведацца. Цалкам магчыма, што ў Рудніцы зімуе некалькі душ, бо летам яе асноўным насельніцтвам здаюцца быць беластачане. У пачатку вёскі драўляная капліча з некалькімі лацінскімі крыжамі на ёй і побач яе.

Вяртаюся за мост, за якім мае адыходзіць дарога ў Татараўцы. Пачатковы адрэзак гэтай дарогі складае прымятая нейкай машынай крапіва, якая даходзіць да двух бетонных кругоў, укінутых у меліярацыйны раўчак, якія — відаць, — маюць выконваць там ролю мастка. Крыху далей зноў набор такіх жа кругоў і след трактара — тут пачынаецца скошаная сенажаць, пачынаецца абшырная паляна, якую сярод лесу яшчэ абрабляюць жыхары Татараўцаў. Скошаныя палеткі перамяжоўваюцца з запушчанымі...

За чарговым мастком з бетонных кругоў пачынаецца крышку насыпаная зямлёй з пракопванага акурат меліярацыйнага раўчака дарога, побач якой ляжаць нядаўна вырваныя карані ад кустоўя, што расло побач таго раўчака. Побач дарогі ў лазіне жуе жуйку статак каля дзесяці кароў. На супрацьлеглым канцы паляны іншы такога ж памеру статак кароў акурат набірае з пашы траву для далейшага перажоўвання ў абедзенны адпачынак. Відаць і аднаго каня, і некалькі паляўнічых вышак, якія сведчаць, што ў наваколлі водзіцца і іншая ад дамашняй буйная фаўна.

У Татараўцах зараз пастаянна пражывае каля двух дзесяткаў душ. Гаспадарыць у вёсцы яшчэ дваіх гаспадароў, якія і трымаюць два згаданыя раней статкі кароў; сырадой возяць яны ў пункт прыёму малака ў адлеглую каля пяці кіламетраў Камянку, адкуль цыстэрны забіраюць яго ў Гайнаўку. Вуліца ў вёсцы жвіровая, вузкая, хаты тут традыцыйныя, шмат якія аднаўляюцца, але палацаў яшчэ ніхто не прыдумаў збудаваць. Дзяцей, якія б вучыліся ў пачатковай школе, у вёсцы няма, а большыя дзеці ездзяць за навукай у Беласток; гімбус у Татараўцы не прыязджае.

На заходнім канцы Татараўцаў стаяць дзве пары крыжоў. У адной агароджы крыжы лацінскія, на каменным высечаны 1902 год; выгляд другога крыжа паказвае на яго радавод з геркаўскай эпохі. У другой агароджы таксама стаіць падобны, „геркаўскі" цэментны крыж, а побач яго высіцца металічны з праваслаўнай перакосінай, на фундаменце якога вырыты толькі год: 1992.

Бабровая пачынаецца ў лесе, земляробчага гаспадарання, як у Татараўцах, там не відаць, затое ёсць некалькі большых збудаванняў, мабыць для прыёму большай колькасці наведвальнікаў. Тут вуліца не такая простая як у Татараўцах, але пакручаная ў розныя бакі. У Бабровай каля дзесятка

Каплічка ў Заязерцах

традыцыйных хат, на некаторых панадворках асталіся яшчэ сельскагаспадарчыя збудаванні. Амаль пасярэдзіне вёскі вялікі стаў. У спякотны дзень на вуліцы няма людзей, няма з кім паразмаўляць.

Кіруюся ў бок колішняй чыгуначнай станцыі Заязерцы, якая павінна быць недалёка ад Бабровай. За вёскай тры расхадныя палявыя дарогі сярод аблагоў; наўгад падаюся ў правую з іх. Заводзіць яна мяне між чарговыя ставы, над адным з іх два мужчыны. Падыходжу да іх спытаць пра дарогу. А яны звяртаюць мне ўвагу, што там прыватны ўчастак, але кажуць перасячы найбліжэйшы панадворак.

Праходжу праз дзве брамы-не-брамы ў плоце-не-плоце побач старой хаты і зараз перада мною, на той непрыкметнай дарозе, якая толькі што вывяла мяне з пастаянна неабжытага прыватнага панадворка, паказваюцца паласатыя дарожныя знакі, інфармацыя блізенькай чыгункі, а зараз за імі і пераезд праз лінію, побач якой перон і мураваны будынак былой станцыі. Яшчэ ў Татараўцах адзін вясковец інфармаваў мяне, што той будынак поўнасцю расцягнуты; так яно аказваецца і на справе — ад станцыйнага будынка асталіся адно сцены і голыя ў іх праёмы ад акон і дзвярэй...

Задумаў я быў наведаць і вёску Лук'яны, што няцэлы кіламетр на ўсход ад чыгуначнага прыпынка Заязерцы; паводле маёй карты ад прыпынку павінна была быць да вёскі дарожка. Дарожкі той прыкмеціць мне не ўдалося, затое ж калі я адышоў мо з кіламетр адзінай, як мне здалося, крыху езджанай лясной дарогай, перада мной, на расхадных лясных дарогах паказаўся дарожны знак, які паказваў, што ў Лук'яны акурат кіламетр адлегласці і то па той дарозе, якою я прыйшоў...

Заязерцы па сутнасці прытуленыя да лесу. У гэтай вёсцы не відаць прымет земляробчага гаспадарання. Большасць панадворкаў выстрыжана касілкамі; магчыма, што з гэтай прыпушчанскай вёскі ўсе калісь параз'язджаліся па гарадах і цяпер яны мо толькі прыязджаюць дзеля разрадкі настальгіі па сваёй малой айчыне, дзе правялі шчаслівыя і бестурботныя маладыя гады. Хаты дбайна дагледжаныя і абноўленыя.

Цікавым месцам у Заязерцах з'яўляецца мураваная адкрытая каплічка з чырвонай цэглы крыху абведзеная чырвонымі штыкецінамі. Дарэчы, на салтысоўскай дошцы аб'яў красуюцца нарысаваныя каляровымі алоўкамі герб гміннага Заблудава і рысунак той вясковай каплічкі, быццам была яна гербам Заязерцаў.

У Камянцы варты ўвагі вялікі камень, устаноўлены там у 1928 годзе ў юбілей дзесяцігоддзя незалежнасці Польшчы. На ім металічная табліца з барэльефам Юзафа Пілсудскага і адпаведным надпісам. Дарога ад Заязерцаў у Рахвалаўку праз Камянку накрыта асфальтавым насцілам, але ж вуліца ў Камянцы, што ад той дарогі адыходзіць, вымашчана, як быццам сама назва вёскі падказвала — каменным брукам.

І Камянка выглядае інакш чым суседненькія Заязерцы. Тут многа хат занядбаных, амаль не відаць такіх цяпер па вёсках модных газонаў размерам у цэлы панадворак. Мо непрывабная Камянка для адпачынку гараджан з далікатным нюхам, бо ж у ёй яшчэ гаспадараць земляробы, пра што сведчыць хаця б выразны пах гною.

У Белмузеі адкрылася фотавыстава Сэржа Ардэна

23 жніўня ў грамадскай зале сабора св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне прайшло адкрыццё выставы мастака Сэржа Ардэна „Нацюрморт".

Наведвальнікам выставы было прапанавана пазнаёміцца з чатырнаццаццю мастацкімі фатаграфіямі і пяццю жывапіснымі творамі. Фотанацюрморты — новая плынь у дзейнасці нашага Музея. Дагэтуль фотаработы нашым культурным цэнтрам яшчэ не эксапанаваліся.

Мастацтвазнаўца Зянон Пазьняк, што ўжо стала добрай традыцыяй, выступіў з дэталёвым мастацкім разборам выстаўленых у Беларускім музеі твораў. Ацэньваючы працу Сэржа Ардэна ў такім складаным жанры як нацюрморт, спадар Пазьняк адзначыў добрае пачуццё колеру і праекцыі ў мастака. У гэтым мог пераканацца кожны з прысутных: яркасць прац толькі дадавала настрою да і гэтак цёплай атмасферы падчас адкрыцця выставы.

Можна быць упэўненым, што карысным для Сэржа Ардэна было пачуць і словы крытыкі спадара Пазьняка, які прафесійна займаецца фатаграфіяй. Бо для чалавека творчага, прафесіянала ў сваёй справе, якім безумоўна з'яўляецца Сэрж Ардэн, такія мерапрыемствы адкрываюць новыя магчымасці для творчага росту і прыдаюць дадатковых сіл ды натхнення.

Частка твораў Сэржа, экспанаваўшыхся на выставе, была з элементамі біблейскай тэматыкі. А праца „Асвячэнне пладоў і мёду" — тэматычная менавіта для жнівеньскага перыяду — часу Спаса.

Прыемна адзначыць і тое, што выстава атрымалася сапраўды інтэрнацыянальнай: на працы беларускага мастака, які вучыўся ў Маскве, а жыве ў Нью-Ёрку, прыйшлі і амерыканскія англамоўныя наведвальнікі.

Сэрж Ардэн ахвяраваў усе свае працы ў фонд Белмузея, а таксама падараваў шмат каму з наведвальнікаў выставы падпісаныя аўтарам творы.

Акрамя таго выстава спадара Сяргея стала яшчэ адным крокам у развіцці новага накірунку дзейнасці нашага Музея. Калі ў першыя два гады мастакі з Беларусі прыязджалі па запрашэнні ў Злучаныя Штаты, то зараз заўважылі з'яўленне новай плыні ў жыцці беларускай дыяспары ЗША: экспануюцца творцы-беларусы, якія стала жывуць у Амерыцы. Белмузей пасля выстаў Алены Тылькінай, якая прайшла ў чэрвені, і Сэржа Ардэна, плануе зладзіць шэраг выстаў беларускіх мастакоў ЗША яшчэ ў гэтым годзе. Будзем, вядома, запрашаць мы і творцаў з нашай роднай Беларусі.

Сэрж Ардэн у сваёй прамове на беларускай мове падзякаваў усім прыйшоўшым на выставу за ўвагу да яго творчасці, а таксама за крытычны аналіз яго працы. Мастак сказаў, што заўсёды трымае ў сэрцы родную Беларусь хоць і жыве ўдалечыні ад Радзімы. Таму можна быць упэўненым, што пажаданне Зянона Пазьняка аб тым, каб выявы і дух роднага краю ў творчасці спадара Сэржа знаходзілі большае адлюстраванне, будзе спраўджана. І, магчыма, праз некаторы час мы ў нашым Музеі будзем глядзець і на полацкія, менскія, навагрудскія, віцебскія і іншыя беларускія краявіды. Жывасць яго твораў сапраўды абуджае такое жаданне.

www.belmuseum.org

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Дзеці ідуць у школу!

Першы дзень у школе. Мы адчуваем, што прыйшоў важны момант у жыцці. Разам з прыходам у першы клас мы пераступаем нябачны парог з дзяцінства ў спеласць. Перад намі гады навукі, абавязкі, змаганне.

1 верасня, аўторак. На спартовым пляцы ля беластоцкай чацвёркі выстойвае знаёмая грамадка. Нашы першакласнікі, выхаванцы беларускага садка. Усе яны загарэлыя і вясёлыя, у вачах іграе яшчэ радасны ўспамін канікул. Ад уражання дзеткі не могуць устаяць на месцы. Ім хочацца яшчэ пабегаць, прыдумаць смешныя гульні... Ім добра і цікава з сабой. Спачатку цяжкавата сабраць іх у адну кучку і зрабіць здымак!

— Хочацца вам у школу? — пытаемся.

— Нееееееее! — гучыць калектыўны адказ.

Мы, аднак, ведаем, што такі адказ не зусім праўдзівы.

А вось і пачатак. Пан дырэктар, Збігнеў Клімовіч, вітае першакласнікаў і іх бацькоў. Спачатку гаворыць пра 1 верасня. Сёння 70 гадоў ад пачатку другой сусветнай вайны. З-за гэтай страшнай падзеі загінулі мільёны людзей. У краіне шмат гавораць пра мір. Мір патрэбны, каб дзеткі раслі з добрымі пачуццямі, каб любілі людзей...

— У нашай школе вы будзеце вывучаць гісторыю, вы даведаецеся хто гэта Гітлер, хто Сталін...

Важныя словы пана дырэктара дзеткі прымаюць з увагай. Хоць усе чакаюць аднаго: калі запросяць іх у новы клас. З новай выхавацелькай. У першым „ц" класе заняткі будзе весці пані Ева Фронцкель, але пакуль яна ў лекарскім водпуску, настаўніцу заступіць спадарыня Марта Куклінская. Першы „ц" клас — шматнацыянальны. Разам з беларусамі тут будуць займацца палякі і чачэнцы. Сярод вясёлай грамадкі сустрэнем добра знаёмыя зорачкі беларускай музычнай дзіцячай сцэны: Юльку Іванюк і Зосю Конюх. Дзяўчаткі падраслі за канікулы, што не пазнаць!

— Я адпачывала над морам, — кажа Зося, — мы ездзілі на Гэль.

— А хочацца ў школу?

— Так!

— Чаму?

— Бо ў чацвёрцы многа каляжанак...

— Мы ведаем, што ў „чацвёрцы" найлепш, — дадае мама Зосі, — бо тут урокі беларускай мовы і цікавыя прапановы для дзяцей і бацькоў. Тэатр, падарожжа ў Беларусь.

Зося пойдзе следам старэйшых сятры і брата.

— Гэта ў нас такая сямейная традыцыя, — кажа Зосіна мама. — У чацвёрцы яшчэ двое нашых дзяцей: Янка ў чацвёртым класе, Оля ў шостым...

— Наш Павел таксама вельмі хацеў ісці ў школу, — прызнаецца Марк Кулакоўскі.

Словы бацькі першакласніка апраўдоўвае выгляд Паўліка. Хлапчук апрануўся як на шлюб, з матылькам-гальштукам. Але і пад мушкай малому хацелася пагуляць з сябрамі..

Новы навучальны год перажываюць бацькі. Разам з дзеткам прыйшлі матулі, таты, старэйшыя сёстры. На пляцы сустракаем Юстыну Апольскую і Яну Красоўскую. Нашы прыгажунькі прыйшлі падтрымаць на духу Кубуся. Куба, родны брат Юстыны, поўдзе ў нулявы клас. І зусім не выглядае на спалоханага, наадварот, хлопчык цікавы сустрэчы з сябрамі, настаўніцай.

— Я таксама прыйшла са старэйшай сястрой, — адзначае Яна, — яна ўжо студэнтка. Праз месяц ад'едзе ў Варшаву...

Юстына і Яна, хоць з розных класаў — сяброўкі. Іх аб'яднала беларуская мова.

— Мы таксама хочам каб наша Юлька вывучала беларускую мову, — кажа пані Галіна Іванюк. І не так важна, што кожны дзень трэба будзе даязджаць з квартала Новае Места. Пытаю ці Юля будзе займацца ў музычных гуртках.

— Вядома, калі будзе такая магчымасць... Бацькі задбалі пра развіццё дзяўчынкі. З першага верасня Юлька пачынае вучобу ў музычнай школе, дзе будзе вывучаць ігру на скрыпцы.

Пра спадзяванні на новы навучальны 2009/10 год спыталі мы і настаўніцу беларускай мовы, Аліну Ваўранюк. Пані Аліна прыйшла палюбавацца сваімі першакласнікамі. Многія з іх пойдуць у беларускія тэатральныя і музычныя калектывы, якімі вылучаецца школа.

— У нас заўсёды добрыя спадзяванні, — кажа настаўніца.

Лік першакласнікаў таксама абнадзейвае, у „ц" класе беларускую мову будуць вывучаць 13 дзяўчынак і хлопчыкаў. Раней яны хадзілі ў беларускі садок...

Пачатак школьнага года паўсюдна адчуваўся на вуліцах Беластока. З гэтай нагоды многія першакласнікі завіталі ў шакаладную кавярню. Іх старэйшыя сябры шпацыравалі па бульварах і гарадскіх парках. Прыемна глядзець на іх радасць. Адначасова, на гарадскім рынку, ішоў мультымедыйны расказ пра жахі апошняй вайны. Мне прыгадаліся словы польскага паэта Чэслава Мілаша, які слова мір спалучаў з адным вобразам — дзецьмі, ідучымі ў школу.

ЗОРКА

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Стары Корнін

Падляшскія шляхі давялі нас у вёску Стары Корнін, што ў Дубіцкай гміне. А чаму якраз наведваем гэтую мясцовасць? Хопіць узгадаць, што побач сябе знаходзяцца тут дзве царквы і ўжо 300 гадоў таму адна з іх была мэтай многіх паломніцтваў.

Вёска Стары Корнін была заснавана перад 1570 годам, калі каралеўскі дваранін Астафій Халецкі заклаў некалькі вёсак на поўдзень ад ракі Нарвы. Апрача Корніна ў гэты час паўсталі суседнія вёскі: Махнатае, Мора, Карыцкі, Істок, Беразова ды іншыя.

Згодна з аповедамі жыхароў, першапачаткова вёска месцілася ў іншым месцы, дзе зараз знаходзіцца поле з назвай *Карнянка*.

Спецыяльна для ўсходнеславянскага насельніцтва, якое пражывала на гэтых землях, быў заснаваны прыход. У самім Старым Корніне праваслаўны прыход паўстаў толькі у 1631 годзе. Пра гэта сведчыць камень з надпісам на царкоўнаславянскай мове, распавядаючым пра гэтую падзею.

Першы старакорнінскі храм меў двух апекуноў: святую Ганну і архістраціга Міхаіла.

Другая старакорнінская царква (яе заступнік — архістраціг Міхаіл) была пабудаваная ў 1724 г. У сувязі з тым, што тэхнічнае становішча будынка было вельмі дрэнным, жыхары Корніна былі вымушаны ў 1893 годзе паставіць новую царкву, якая стаіць да сённяшняга дня. Царква св. Ганны ў такім выглядзе, як бачым яе сёння, была пабудавана ў 1892 г.

У мінулым Стары Корнін быў славуты не толькі дзвюма цэрквамі але перадусім цудатворнай іконай Божай Маці, якая знаходзілася ў адной з іх. Пра пачаткі культу старакорнінскай іконы Божай Маці захаваліся многія легенды і расповеды.

Адна з версій гаворыць, што калі ікона знаходзілася ў каменным алтары царквы св. Ганны і св. Міхаіла, ад свячы, што стаяла перад ёй, запаліўся алтар. Хаця пажар быў патушаны настаяцелем царквы, вялікая часць алтара згарэла. Ікона Божай Маці зусім не пацярпела. Пасля гэтага некалькі разоў перад іконай знаходзілі палаючую свячу, што прыхаджане ўспрынялі як доказ Божай ласкі.

Іншая гісторыя гаворыць, што пасля пажару царквы ў суседніх Дубічах-Царкоўных настаяцель са Старога Корніна паслаў у Дубічы з гэтай іконай старца, які меў збіраць грошы на аднаўленне дубіцкага храма. Аднойчы, калі дзед спаў з іконай, корнінскі войт, што праязджаў побач, убачыў святло, ззяючае ад іконы. Забраў яе ў Стары Корнін, дзе надалей выпраменьвала з сябе святло.

У 1709 годзе ў час эпідэміі мору святло надалей біла ад іконы і пачала яна аздараўляць людзей, што перад ёю маліліся. У гэтым самым годзе аднаму жыхару ды настаяцелю старакорнінскай царквы явілася Божая Маці і хворыя людзі пачалі прыбягаць у царкву ў час эпідэміі ды атрымлівалі аздараўленне. Год 1709 можам тады лічыць пачаткам культу старакорнінскай іконы Божай Маці.

Да сёння ікона ў Старым Корніне не захавалася. У 1915 годзе, калі ўсё тутэйшае насельніцтва падалося ў бежанства ўцякаючы перад нямецкімі войскамі, ікона Прасвятой Багародзіцы была вывезена ў глыб Расіі, адкуль ніколі не вярнулася.

Тэст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Міра ЛУКША

Кныр з Кнаразоў

Кныр Маўрыкій — невялікі, а ў Маргарыты — большыя габарыты. Найбольшы амбарас — каб абое былі ў самы раз. Дыбам шчэць. Лычом — верць! Вырыта каля карыта: „Маўрыкій плюс Рыта". Пара каларытная! Парнакапытная. Маўрыкій — у латкі, Маргарыта ж — гладкая, бела-ружовая свінка вясковая. Дзеткі ж у іх малыя — вепручкі рабыя — Рычард і Рыналд. На ўсю вёску гвалт! Аж пахрыплі, так вішчэлі, разам з татам у гразь селі. — Ну, як свінні! — лае Рыта і сямейку пхне ў карыта, каб пачысціць іх як след, не смяяўся каб сусед у Кнаразах ці ў Храбалах убачыўшы той свінскі жах! Усё чыста — бацька, дзеці!.. Прыгажэй няма ў свеце!

Музыка з кайфам

Срэбнае вяселле — шалёнае шоў

Вяселле для таго, каб людзі весяліліся. Радасць, пачуцці, сяброўства і блізкія — адна сям'я. Такую сямейную атмасферу стараецца стварыць на сваіх сустрэчах са слухачамі „Фрык кабарэ бэнд Серебряная свадьба".

„Серебряная свадьба" гэта па-беларуску „срэбнае вяселле", але калі я спыталася ў гурта, адкуль у іх думка на назву, адказалі: „Нас захапіла творчасць калектыву „Залатое кальцо" і таму прыдумалі вельмі блізкі назоў".

Ну вось, калі ёсць пярсцёнак, праўдападобна будзе і вяселле! Але „срэбнае вяселле" мае і сваё асобнае значэнне. „Срэбнае вяселле" адзначаюць сужонствы, якія пражылі з сабой 25 гадоў! Мо і на столькі спадзяюцца ўдзельнікі „Серебряной свадьбы". Пакуль што, займаюцца сваёй творчай дзейнасцю нягледзячы на будучыню, бо і сённяшні дзень для іх вельмі паспяховы. Канцэртуюць круглы год. Сустракаюць іх фанаты ў Расіі, Украіне, Польшчы, Нямеччыне, Галандыі, Францыі ды іншых краінах. Зрэдку выступаюць у Беларусі.

— Таму і не спяваем на беларускай мове, у нас няшмат выступаў у роднай краіне.

Але гурт прыняў нядаўна ўдзел у праекце „Тузін. Перагрузка". Гэта ідэя, якая мае заахвоціць рускамоўныя гурты ў Беларусі пачаць спяваць на беларускай мове, што і паспяхова атрымліваецца. Так як і ў выпадку „Серебряной свадьбы".

— У выпадку нашых музыкаў роднай мовай з'яўляецца руская мова, таму і на ёй выступаем, — кажа менэджар гурту. — Але гурт мае ўжо дзве кампазіцыі па-беларуску! — дадае ганарліва.

„Серебряная свадьба" гэта гурт, які мае нашмат больш прывабнасцей. Па-першае, таленавітую вакалістку, якая з тэатральных сцэн на музычныя мерапрыемствы пераносіць атмасферу нечаканасці, жарту, таямніцы, багаццё касцюмаў і колераў. Па-другое: гэта таленавітыя музыкі, якія, дарэчы, з'яўляюцца прафесіяналамі, працуюць ва ўсялякіх музычных ці оперных тэатрах. Да гэтага ўсяго на сцэне пануе радасць, зразуменне і сапраўдная гульня, бо гэты гурт гэта мяшанка кабарэ ды шматлікіх музычных жанраў. „Серебряная свадьба" гэта абдуманае, упарадкаванае, шалёнае шоў.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 37

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 32:

Развіццё, слон, Ас, свой, Яна. Світ, бач, матыў, хата, парка. Малы, смак, ар, Сват, асвета, злоты, вой, фін, яблык, цана, вёсачка.



Гданьск, 1 верасня



1 верасня Гданьск быў найважнейшым горадам у Польшчы і адным з важнейшых у свеце. Адбываліся тут урачыстасці з нагоды 70 гадавіны выбуху другой сусветнай вайны.

— Якая атмасфера ў Трыгарадзе напярэдадні першага верасня? — пытаў мяне сябра ў тэлефанічнай гутарцы.

Трэба сказаць, што 31 жніўня, апрача польскіх нацыянальных сцягоў, не было тут ніводных характэрных рысаў, якія гаварылі б аб тым, што праз дзень з'едуцца сюды многія важныя палітыкі з усяго свету. Толькі аб прыездзе прэм'ер-міністра Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна інфармаваў гурт з шасцёх бубначоў, якія ў рыфмах родам з вуліц Рыё-дэ-Жанэйра інфармавалі аб парушэннях правоў чалавека ў Расіі. Арыгінальная ініцыятыва, калі б не лістоўкі, якія раздаваў гурт. Большасць іх зместу фактычна складалі інфармацыі пра грамадзянскія правы, пра Чачню. Але гінула гэта зусім, бо найбольш відавочная была частка, у якой... гурт расказваў сам пра сябе і даваў свае інтэрнэтныя і тэлефонныя каардынаты.

— Вэстэрплятэ? Значыцца, журналісты? — спытаўся ў нас таксіст, з якім перад чацвёртай ранкам ехалі мы на ўрачыстасці. Дарэчы, 1 верасня, калі ўвесь дзень давялося ездзіць па Гданьску на таксі, здалося мне, што адзінай групай жыхароў Гданьска, якая ў гэты дзень мела кантакт з Вэстэрплятэ, былі якраз таксісты. Лік гасцей і журналістаў, якіх туды яны прывозілі, быў агромны.

Калі прэзідэнт Лех Качынскі і прэм'ер Дональд Туск выступалі падчас ранішніх урачыстасцей, у прэс-цэнтры побач помніка героям Вэстэрплятэ працавала няшмат журналістаў. Цэнтр падрыхтаваны на прыбыццё тысячы журналістаў запоўніўся ў чвэрці. Журналісты, якія не былі аператарамі камераў ні фотарэпарцёрамі, не маглі ўвайсці ў зону дзе праходзілі святкаванні. Хаця прэс-цэнтр знаходзіўся некалькі дзесяткаў метраў ад помніка, адгароджваў яго вялікі плот.

У момант, калі пачыналіся галоўныя пасляпаўднёвыя ўрачыстасці з удзелам замежных гасцей, прэс-цэнтр фактычна запоўніўся. У момант пасля найбольш чаканага выступлення Уладзіміра Пуціна, ажно вальней пачаў дзейнічаць інтэрнэт у прэс-цэнтры.

— Спадарства, пэўна, журналісты? — пачулі мы ў паваротнай дарозе ад таксіста.

На жаль, ва усёй медыйнай прасторы, якая засяроджвалася на двух героях: Уладзіміру Пуціне і Дональду Туску, недзе прапала інфармацыя, што ў той сам дзень прэм'ер Польшчы сустрэўся з прем'ерам Беларусі Сяргеем Сідорскім, які ўзначальваў беларускую дэлегацыю.

Міхась СЦЕПАНЮК

Ваенны час у Орлі

Міхал МІНЦЭВІЧ

Сёлета мінае семдзесят гадоў ад выбуху другой сусветнай вайны. Падзеі таго часу захаваліся ў памяці іх мясцовых сведкаў. Асабліва цяжкія ўспаміны захаваліся ў сем'ях ахвяр.

— Жыд бег нашай вуліцай Аграданай, — успамінае Вольга Герасімюк з роду Война 1929 года нараджэння, якая цяпер тут жыве, — а за ім ужо беглі тыя саветы. Жыд называўся Мышы Кулі, быў шаўцом і жыў у той нарожнай хаце, дзе пасля жылі Хурсы. Ускочыў у тую трупярню, а там былі ўжо бітком набітыя людзі. І Якімовічка, што стаяла звонку, крычала мужу: „Алёша, Алёша, хадзі! Міша (бацька расказчыцы — М. М.), хадзі!" Абодва яны былі кумамі, аднак яны не паслухалі, не хацелі быць у тым будынку. А крыху раней прыйшоў бацькаў брат Валодзя з жонкай Тонькай і прасілі бацьку, каб кідаў усё, хацелі забраць яго ў Кашалі, бо туды ўжо, да мамінага брата Шчыгла, перабралася мама з пяцёркай нас, дзяцей. А Алёша Якімовіч быў сказаў бацьку ісці з ім каня разам напаіць. Вось так было. Жыд схаваўся ў будынак трупярні і тады саветы прычапіліся да нашых, што ішлі каня паіць, і быў канец. Адразу па іх стралялі, здалёк, а дабілі зблізу.

Мама зайшла пад будынак, дзе пазней была гміна, то побач на зямлі была цэлая калюжына крыві. Стаяла вялікая жара, прыпякала сонца. А ён, бацька, ляжаў басанож, без паска ад штаноў, без дакументаў. Забітаму забралі дакументы, сцягнулі боты. Меў тры раны ад куляў, адна ў скроні, мабыць дабівалі. Бацька выглядаў як афіцэр, хадзіў у зялёным, меў нагавіцы галіфэ, боты гольфы. І цяпер я пытаю: хто гэта забраў ад яго? Ці той салдат, што страляў браў бы? Мы ўпэўнены, што бацька меў пры сабе грошы, бо ў Кашалях меў далучыцца да нас.

А пасля па Орлі пайшла пагалоска, што меў дакументы, што меў многа дзяцей, што шкадаваў той салдат: „Что я наделал?" Але невядома хто забіў, мо нейкія шпіёны... Тады гаварылі што саветы, што то былі „чушкі" — „твая мая не панімае"; так іх тады называлі. І п'яных тады не было, такая цішыня ў Орлі стаяла, аж страх.

Кум Якімовіч, калі б паранены астаўся ляжаць у бульбе, то яго можа і не знайшлі б. А ён меў яшчэ столькі сілы што, думаючы, што яго ніхто не пільнуе, пералез праз вуліцу і ў Юстынавых агародзе сканаў. Бо быў ранены ў калена і, мабыць, памёр ад сцёку крыві.

Ці хавалі ў адзін дзень? Мы тады былі ў Кашалях, то нашы сваякі Жураўлі хуценька тую труну рабілі. І газай злівалі цела, бо ўжо раскладалася ад жары. Хавалі без бацюшкі; мама ішла з тым, што труну рабіў. Пахавалі на акраіне могільніка. І па іх нехта ў той час з лесу страляў. Якімовіча хавалі на другі дзень. А сям'ю Вярбіцкіх — сына і бацькоў — хавалі апошнімі; яны былі страшэнна пабіты, у іх рукі павыкручваны былі. Салдаты тыя вельмі злосныя былі.

Была я найстарэйшай з нас пецярых дзяцей. Усё нам забралі. Нямецкі бурмістр Сандэцкі заняў наш цэлы пляц, які распасціраўся ад сённяшняга асяродка здароўя да аптэкі. З аграномам засадзіў сабе сад. Будынак асяродка — яўрэя Ёлкі Ліманскага — Сандэцкі загадаў яўрэям разбудаваць. У Сандэцкага быў сын. Мы хадзілі да іх калядаваць, умелі спяваць па-нямецку, прымала нас ягоная жонка.

Міхал Война (справа) ў час вайсковай службы

Сандэцкі хацеў мяне выслаць на работы ў Прусію, да сябе гусей пасвіць. А мама стала плакаць: „Як так можаш? (Была з ім на „ты".) Ты ж нам пляц забраў..." То ён пасля даваў нам поле ў іншым месцы, на Пакатоўшчыне з боку Кашалёў. І за дзесяць марак карову нам даў. Пашкадаваў нас, добры быў. А калі на вайне рускія забілі ягонага сына, то яшчэ лепшым стаў.

Помню, быў рускі палонны, Хацімаў хіба называўся, то ён Сандэцкаму электраток гнаў, круціўшы дынама ў будцы каля хаты. Мы, дзеці, праз дзірку ў сцяне заглядалі ў тую будку.

Пры немцах хадзілі мы ў школу; жыды ўжо не вучыліся. Я на працу хадзіла. Немцы загадалі пасеяць каўчук на полі за Орляй, што з боку Спічкоў. Расло тое зелле з малачаём, палолі мы палетак. Але вырас толькі малачай. Пільнаваў нас Ванька Лемеш з Кашалёў. Я не магла вытрываць на сонцы і пайшла вады напіцца. А той нямецкі аграном, які жыў каля млына, прыехаў пасля на кані і сляды мае пабачыў. Дапытваўся, але ніхто мяне не выдаў, то ён тады Лемеша ўдарыў.

— Калі з Орлі адступалі „першыя" саветы, — расказвае Жэня Пасечнік з роду Амельяновіч 1932 года нараджэння, — а наступалі немцы, то мой тата Мяфодзі адвёз мяне да сваякоў у Тафілаўцы. Мама Аляксандра хворая была, увесь час ляжала. Я ў Орлю прыходзіла кожны другі дзень. Па дарозе ў лесе каля Рудутаў бачыла забітых савецкіх байцоў — яны былі страшэнна пакалечаны, вантробы наверсе былі.

У нашай сям'і ў той час вялікая бяда здарылася — трагічна загінуў мой адзіны брат Сярожа. А было гэта так: пры немцах адзін савецкі палонны стаў шафёрам і вазіў самаходам збожжа са складу, які быў каля тадышняй гміны (цяпер там жыве сям'я Спораў — М. М.). Дзеці, як гэта дзеці, чапляліся самахода каб хвілінку праехацца і пасля саскочыць. Мой брат зачапіўся за нешта пятліцай ад паліто і не мог саскочыць. Пакуль пятліца парвалася, майго брата ўцягнула на павароце пад колы, мазгі вылезлі. Загінуў на месцы, было яму дзевяць гадоў.

Марыя і Аляксей Якімовічы

Цяжка было жыць. Калі маме крыху паправілася здароўе, то булкі пякла. Гаварыла: „Будуць ісці салдаты бедныя, трэба іх будзе пачаставаць хлебам, малаком". У нас дзве каровы было.

Як сюдою „другія" саветы праходзілі, то страшна было. Мама хлеб пякла, яшчэ з печы не выняла сырога, а салдаты тыя ўжо крычаць: „Мамаша дай, бо мы галодныя; кушаць хочацца, нет нічаво!" У мамы сухары былі, то яна ім у сумачкі што-небудзь давала. Ой, страшна было!

Саветы сваіх раненых тут пакідалі. То мама давала мне малако занесці раненым. Насіла я ў двух вядзерцах, бо адно было мне зацяжка несці. Салдаты давалі людзям цукар у кавалках, часам мыла.

Зажалі і зжалі

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Прыйшоў канец дажджліваму лету. Наступіў апошні высып летніх фэстаў-святкаванняў, калі штотыдзень гулялі вёскі, мястэчкі ды гарады, а асабліва багата ў фэсты ў крызісны час. Дайшлі шчасліва да дажынак, перад капаннем бульбы. Людзі кажуць, што і бульба павымакала. Але няма што сумаваць, тым больш, што нашу краіну неяк той крызіс не чапае (так пішуць пра польскую гаспадарку). У новы гаспадарчы час найгорш маецца культура, якую ўсё ж трэба культываваць. І Падляшскі музей, які мае свой філіял — Беластоцкі музей вёскі пад Асовічамі (Васількаўская гміна), запрасіў на чарговы народны фэст — „Дажынкі ў скансэне"— на 30 жніўня. Чаго тут не было раней — і ваяры, і вяселле, і самагонаварэнне, і шмат смачнага для душы і цела. Каму спатрэбіцца касіска ў горадзе Беластоку? Амаль кожны гараджанін мае свае маленькія сенакосы ці жніво. Вядома, сярод маляўніча раскінутых збудаванняў перанесеных з вёсак Беласточчыны найлепш паказваеца фальклор. Народ едзе абкупіцца смакоцем і прыгожымі патрэбнымі вырабамі з латкоў сялян і рамеснікаў Падляшша і паслухаць ды пяглядзець, як калісьці бывала.

Студзянкі вітаюць вас!

У праграме прадбачвалася традыцыя: жніўныя песні ў выкананні фальклорных ансамбляў, паказ кашэння збожжа і іншых жніўных прац, вязанне перапёлкі і дажынкавых вянкоў. Са сцэны было аб'яўлена: у гэты прыгожы дзень гледачы азнаёмяцца з польскімі, літоўскімі (з Пуньска) і ўкраінскімі, усходне-паўднёвымі жніўнымі абарадамі. Паказана будзе талака, калі ўсёй вёскай бяруцца за жацьбу сяляне. Абрад будзе адбывацца ў полі (у скансэне ёсць і пасеяныя ды скошаныя палеткі збожжа і іншых культур), пасля карагод пойдзе ў двор, а пасля з вянкамі — на сцэну. Ядвіга Канопка, Юліта Харытанюк з Падляшскай маршалкоўскай управы і дырэктар музея Артур Гавел аб'явілі, што ўкраінцамі будуць людзі з калектыву з Маліннік. А першыя на сцэну ўвайшлі жанчыны з падвасількоўскай вёскі (7 км за Васількавам) — са Студзянак, каляровыя як стройныя мальвы „Мальвянкі" са сваім інструктарам Янушам Хамутоўскім, і грымнулі на ўсё горла... па-беларуску. „Каля рэчкі, каля броду",, „Ой, у лузе пры каліне", „Чорны вочкі"... Умеюць і валачобныя песні-канапелькі. Вядома, і па-польску заспявалі пупулярныя песні, але зрабілі і рэкламу сваёй вёсцы, дзе палову праваслаўныя складаюць, а палову каталікі. „Супрасль-рэчка тут плыве, і паветра чыстае, і лясы сасновыя наўкол шумналістыя..." За імі зараз на сцэну выйшлі „Каласкі" з Алай Каменскай і маладой фальклорна-сучаснай праграмай. А „сяляне" з пад Пуньска, Маліннік, Краснага Сяла і Дубяжына, апранутыя па-калісьняму, з прыладамі ў далонях, з „дзяцьмі" ў плахтах падаліся ў поле. А твары нашых паўднёва-ўсходніх — добра вядомыя нам хоць бы з аглядаў беларускай песні. Ну, што ж, сказаў дырэктар Гавел, паўтараючы за кімсьці моцна вучоным, мае быць гэта ўкраінскі абрад...

Багаты жніўны вянок ад Студзянак

А мы падаліся за „Мальвянкамі" ў Студзянкі, на іхнія дажынкі, арганізаваныя самой вёскай, пры падтрымцы гміны. Януш Хамутоўскі кажа пра гэтую вялікую і сучасную вёску, што гэта „спальня Беластока", прыемнейшая, скажам, за недалёкі Васількаў, што сапраўды пануе ў ёй вясковая, ціхая атмасфера, а ёсць усе выгоды — і дом культуры, і харошы стадыён (якраз будуюцца на схіле натуральнага абрыву лаўкі для заўзятараў), будуюць цяпер і амфітэатр. Усе мерапрыемствы маюць вельмі прыгожае і густоўнае сцэнічнае афармленне. У чымсьці нагадваюць Студзянкі Залукі, хоць тыя намнога меншыя і не маюць усяго таго, што здабылі Студзянкі. Дарэчы, калектыў „Мальвянкі" заўсёды ездзіць на мерапрыемствы ў Залукі, а іхнія „Каліна" і „Калінка" таксама гасцююць у „Мальвянак". І заўсёды ладзяць уласнымі намаганнямі шчодрыя балі. Сябруюць таксама школы, настаўнікі. Сёння ўсе спачатку пойдуць на Гару, каб пасвянціць крыж. Тут пару сот гадоў стаяў праваслаўны крыж. Муршэў, падаў ад старасці. Цяпер праваслаўны спонсар узвёў высокі крыж, у гэты раз „міждународны", як яго назвалі, і ўсе — госці дажынак і гаспадары розных веравызнанняў узбяруцца на сапраўдную строму, у бок Гараднянкі, каб урачыста, пры саслужэнні бацюшкі Анатоля і ксяндза Яна, пасвянціць крыж, пакланіцца яму і пацалаваць ягоны стройны залаты камель. Пасля калектывы з вянкамі і са старастамі Аляксеем Жукоўскім і Маргарытай Шчэрбай панеслі сімвалічны плён у рукі старасты Беластоцкага павета і войта Васількаўскай гміны.

Пачаліся выступленні, пад гоман футбольнага матча Студзянкі — Супрасль (1:3). Першая на сцэну, за якой спакойна пасвіліся белыя козкі, выйшла „Калінка", і прагучала з яе новай кружэлкі, як там запісана на пачатку — „Люблю наш край, старонку гэту" ды іншыя песні, вядомыя з рэпертуару гэтага заслужанага маладога ансамбля ад 2002 года (новы склад працуе ад сакавіка г.г.). Затое „старая" „Каліна" падрыхтавала на студзянскія дажынкі выключна жніўны матэрыял, пачынаючы ад „Ой, пойдзем мы, пойдзем у поле жыта жаці". Па-беларуску большасць песень заспявалі таксама „Журавінкі" з падбеластоцкіх Агароднічак (у бок Супрасля), а са сваіх (бо яны і пішуць самі тэксты, асабліва пані Ніна Панкевіч) найлепшая ў іх песня пра слаўную вёску Агароднічкі. З беларускіх вясковых мерапрыемстваў вядомая таксама „Чорная ягада" з Чорнай-Беластоцкай, якой немаладыя спявачкі ніколі не хочуць пакідаць такіх свойскіх мерапрыемстваў, бо для іх гэта і свята, і аддышка ад штодзённасці, і магчымасць сустрэчы з мілымі людзьмі і мясцінамі. Ну, нельга сказаць, што такія мерапрыемствы збіраюць толькі старэйшае пакаленне. Бо выступалі і маладыя (фальклорны ансамбль са Студзянак, мажарэткі з духавога маладзёжнага васількоўскага аркестра), і сярод гасцей было мноства і моладзі, і малечаў.

Свенцяць плён бацюшка і ксёндз

І студзянскія дажынкі здаліся мне проста звычайным вясковым святам, без трафарэтных плёнаў лета і чалавечай працы. Хоць наўкола ўсё пакошана, пожня пахне нафтай і жалезівам.

Трэці „Wymiar”

Сёлетнія спектаклі, фільмавыя паказы і канцэрты ў рамках фестывалю „Inny wymiar — sąsiedzi” адбываліся ў Беластоку пад лозунгам: „Jesteśmy tacy sami” (1 — 6.09.2009). Гэта быў трэці выпуск мерапрыемства. У гэты раз прысвечана яно было Расіі. У час папярэдніх выданняў прадстаўляліся культуры яўрэяў і беларусаў.

На працягу шасці дзён паказаны былі дакументальныя і мастацкія фільмы пастаўленыя ў Ізраілі, Эстоніі, Нямеччыне і Літве. Толькі адзін фільм быў расійскай вытворчасці. Гэтую частку адкрыў паўтарагадзінны эстонскі дакументальны фільм „Пляц Каліноўскага”, пастаўлены Юрыем Хашчавацкім, апавядаючы пра падзеі непасрэдна папярэджваючыя прэзідэнцкія выбары і іх ход у Беларусі ў сакавіку 2006 г. Не расіяне, а беларусы былі найважнейшымі ўдзельнікамі (за афіцыйным сталом) дэбаты: „Польшча — Расія, пабраціцтва ці варожасць”. Прынялі ў ім удзел беларусы гісторык прафесар Антон Мірановіч — выкладчык Універсітэта ў Беластоку ды журналіст тэлебачаня „БелСат” Юры Каліна, а таксама ўзбек Шаміль Закіраў — рэжысёр маскоўскага Дзяржаўнага канцэртнага агенцтва „Содружество”, у 1977—1984 гадах дыктар брэжнеўскага Цэнтральнага тэлебачання СССР, ды Андрэй Раманчук з Расійскага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку. На крэслах залы Цэнтра імя Людвіка Заменгофа засела каля трыццаці асоб, у большасці звязаных з РГКТ. Шаміль Закіраў пералічваў з задавальненнем расійскія мерапрыемствы арганізаваныя ў апошня гады ў Польшчы і польскія ў Расіі, асабліва звязаныя з сур’ёзнай музыкай. Дадаў пры нагодзе: „Еўропа гэта не толькі германска-раманскі свет, але і славянскі, са сваёй душой і каранямі”.

Рашуча на тэму канферэнцыі спаслаўся праф. Мірановіч, член аднаго з польска-расійскіх калектываў Акадэміі навук:

— Калі мы ў змозе справіцца з гістарычнай рэфлексіяй, трэба не толькі пазнаёміцца з фактамі, але таксама адарвацца ад свайго нацыянальнага пункту гледжання. Не можам выказваць думак ці патрабаваць ад аднаго ці другога боку слоў просьбы прабачэння, без крытычнага пагляду на самога сябе.

Падкрэсліў, што ў Польшчы „прынамсі за апошня два стагоддзі” Расія станавілася краінай варожай і чужой, а ў Расіі паявіўся вобраз Польшчы, якая з’яўляецца „здраднікам Славяншчыны і славянскіх інтарэсаў, якая толькі цікуе на дзяржаўную тоеснасць і культуру Расіі”.

— У Польшчы пакутуем хваробай суседства, асабліва ў рэляцыях паміж Польшчай і Расіяй. Наша патрыятычнае выхаванне заўсёды прымала пад увагу антырасійскі фактар. Можна гэта прыкмеціць таксама ў літаратуры і мастацтве. (...). У Расіі Польшча часта бачыцца як краіна, якая заўсёды стаіць у авангардзе агрэсіі на Усход.

Адзначыў:

— Пытанне, на якім павароце мы апынуліся, ці да братэрства, ці да варожасці, адкрытае. Усё залежыць ад таго, наколькі палітычныя эліты, эліты ўлады, эліты культуры, пяройдуць над падзеламі ды сваімі непрыязнасцямі і пачнуць успрымаць суседа перш за ўсё як партнёра, з якім часта па-над балючымі гістарычнымі фактамі бачыцца будучыня.

Юры Каліна з пункту гледжання тэлежурналіста адзначыў, што ў Польшчы не паказваецца не толькі амбітная, але і камерцыйная расійскія высакаякасная фільмавая прадукцыя.

Затое Андрэй Раманчук заявіў:

— У Расіі польская культура больш вядомая сярэдняму гледачу чым наадварот (...). Зачаста шукаем запальных, чым супольных пунктаў.

У рамках „Іншага вымярэння” адбыліся таксама м.інш. І Веласіпедны рэйд імя палкоўніка Мікалая Кавеліна, вернісаж выставы прысвечанай гэтаму аселаму каля Беластока палкоўніку царскай арміі. „Чыста” расійскі быў джазавы канцэрт ансамбля Валерыя Кісялёва з Масквы. Паказаны быў таксама фільм „Шостая частка свету” (з жывой музыкай) Дзігі Вертава (Барыса Каўфмана), народжанага ў Беластоку, з яўрэйскага роду, стваральніка расійскага дакументальнага кіно. У рамках фільмавых паказаў можна было паглядзець фабулярны фільм у польскім перакладзе „Żart” (арыгінальны загаловак „Розыгрыш”; польскі пераклад, далікатна кажучы, быў далёкі ад арыгінала, а нават супярэчлівы яму, як загаловак, уводзячы ў зман польскамоўнага гледача) у рэжысуры беларуса Андрэя Кудзіненкі, а пастаўлены ў Маскве. Беластачане ведаюць ягоны іншы фільм пастаўлены ў Беларусі: „Містэрыя. Акупацыя”, які расказвае аб беларускіх лёсах у час вайны. На жаль, хоць чакаўся, на сустрэчы з беластоцкімі гледачамі аўтар не паявіўся. Арганізатары фестывалю тлумачыліся, што мусіў быў ён застацца на плане... першага беларускага жахлівіка. Фільм расказваў пра „клапатлівыя” этнічныя і маральныя паводзіны маскоўскай падрастаючай моладзі. Сустрэтая намі пасля паказу Барбара Пякарская са згуртавання „АБ-БА”, якое займаецца ў Беластоку беларускімі дзецьмі і моладдзю, сказала: „Тое, што паказана ў гэтым фільме, здараецца ўсюды, у кожнай школе”.

Шкада толькі , што нельга было спытацца ў рэжысёра, чаму такі фільм зрабіў якраз у Маскве, а не ў Беларусі.

У перадапошні вечар фестывалю (каштаваў ён гарадскіх арганізатараў 180 тыс. зл.) беластачане ўзялі ўдзел у канцэрце „Мы такія самыя”. Выступілі: варшаўскі „Żywiołak”, чарнёвіцкі (Украіна) „Hutsul Calypso” і незалежна ад холаду цёпла ўспрыняты беларускі — гарадоцка-гайнаўска-беластоцкі „Projekt Ilo&Friends” з салісткай Ілонай Карпюк, на штодзень журналісткай „Нівы” і Радыё Рацыя. Быў гэта першы выступ гэтага гурта перад такой масавай беластоцкай публікай.

Расійскае выданне „Innego Wymiaru” завяршыла адкрыццё выставы аб татарах і смакаванне татарскіх страў.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Так склалася, што Чэхія ў гісторыі беларускага адраджэнскага руху на працягу дзесяцігоддзяў адыгрывала далёка не апошнюю ролю. Дастаткова ўзгадаць, што менавіта ў Празе месцілася ў свой час Рада БНР.

Цяпер таксама горад над Влтавай стаў адным з цэнтраў беларускага дэмакратычнага руху за мяжой. Немалая колькасць сайтаў разнастайных беларускіх арганізацый, што месцяцца ў Чэхіі, ёсць таму пацвярджэннем. Сярод іх сайт „Грамадзянская Беларусь”, які знаходзіцца па адрасе www.be.civicbelarus.eu.

Цэлы сайт выкананы ў белым і чырвоным колерах. Ён падзелены на традыцыйныя тры часткі. Злева месцяцца выйсці да розных рубрык сайта, іх, дарэчы, даволі многа — больш за дзесяць. Пасярэдзіне знаходзіцца інфармацыя, якую аўтары і ўладальнікі сайта лічаць патрэбным давесці да чытачоў. З правага боку — банэры некаторых іншых інтэрнэт-парталаў агульнай з „Грамадзянскай Беларуссю” накіраванасці.

Выйсці да іншых рубрык сайта ўласна маюць не адразу заўважнае дзяленне між сабой. На чырвоным фоне напісаны тыя, якія вядуць да расповедаў, што нейкім чынам тычацца іншых арганізацый. Да прыкладу, „Эўрапейскае радыё для Беларусі”, „Дом правоў чалавека ў Вільні”, „Стыпендыі” выводзяць на разнастайныя сайты. Для вучнёўскай моладзі, пэўна, найбольш цікавай будзе апошняя з пералічаных старонак, бо яна падае інфармацыю пра магчымасць навучання ў розных чэшскіх ВНУ коштам гэтых устаноў. Праўда, многія са стыпендый разлічаны на студэнтаў з Беларусі, якія падвяргаюцца пераследу з боку лукашэнкаўскага рэжыму.

Апошная „вонкавая” старонка — „Супрацоўніцтва”. Тут аўтары сайту заклікаюць наведвальнікаў кантактаваць з імі, калі ёсць жаданне знайсці партнёра ў Чэшскай Рэспубліцы для рэалізацыі таго ці іншага праекта. „Вашую прапанову мы перадамо чэскім арганізацыям і можам разьмясьціць на нашых старонках”, — абяцаюць у „Грамадзянскай Беларусі”.

Што ж тычыцца звестак аб уласна арганізацыі, то сціплыя „грамадзянцы” змясцілі іх унізе цэлага пераліку. „Міжнароднае аб’яднаньне Грамадзянская Беларусь было заснавана ў 2004 годзе з мэтай усебаковай падтрымкі дэмакратычных ініцыятываў і разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці на Беларусі, — распавядаецца ў рубрыцы „Пра нас”. — Аб’яднаньне імкнецца да падтрымкі няўрадавых і непрыбытковых арганізацый на Беларусі, улучна тых грамадзянскіх ініцыятываў, якія былі рэжымам Аляксандра Лукашэнкі пазбаўлены магчымасьцяў дзейнічаць легальна. Мэтай аб’яднаньня зьяўляецца падтрымка разьвіцьця беларускіх няўрадавых арганізацый і іх узаемнага супрацоўніцтва з чэскімі партнэрамі. Грамадзянская Беларусь таксама імкнецца перадаваць чэскі досьвед грамадзкай і палітычнай трансфармацыі на Беларусь”.

Адметна, што, нягледзячы на сваю сціпласць, „грамадзянцы” ў гэтай рубрыцы не цураюцца распавесці аб заснавальніках і сябрах аб’яднання.

Пэўна, выкліча інтарэс старонка „Фотагалерэя”, дзе месцяцца фотаздымкі візіта ў Чэхію лідэра руху „За свабоду” Аляксандра Мілінкевіча, адкрыцця Дому правоў чалавека ў Вільні і інтэрв’ю колішняга прэзідэнта Чэхіі Вацлава Гавэла, што ён даў радыёстанцыі „Еўрарадыё” ў 2007 годзе.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Экстраліга рушыла

Пачатак восені выдаўся досыць цёплым. І толькі старт адкрытага чэмпіянату Беларусі па хакеі нагадвае пра тое, што пачынаецца новы прыродны сезон. Што датычыць першынства беларускай экстралігі, то яе розыгрыш абяцае быць надзвычай цікавым. Удзел у турніры, акрамя 11 беларускіх клубаў, бяруць каманды з Латвіі і Украіны. Вось поўны пералік 14 прэтэндэнтаў: „Юнацтва” (Мінск), „Гомель”, „Металург” (Жлобін), „Хімвалакно” (Магілёў), „Віцебск”, „Керамін” (Мінск), „Нёман” (Гродна), „Хімік”-СКА (Наваполацк), „Шыннік” (Бабруйск), „Брэст”, „Шахцёр” (Салігорск), „Металургс” (Ліепая, Латвія), „Дынама-Юніёрс” (Рыга, Латвія), „Сокал” (Кіеў). Прычым у адрозненне ад мінулага сезону іншаземныя каманды маюць права выступіць у плэй-оф. Канешне, толькі тады, калі туды праб’юцца. Па выніках чатырох кругоў змагання між сабой васьмёрка лепшых па класічнай схеме возьмецца за размеркаванне медалёў. Прычым серыя за 3-яе месца праводзіцца не будзе — бронзу атрымае той з прайграўшых у паўфінале, які зойме больш высокае месца па выніках рэгулярнага чэмпіянату. Важна, што ў першынстве існуе ліміт на легіянераў — на канкрэтную гульню можна замаўляць не больш пяці замежнікаў.

Варта звярнуць увагу на вяртанне ў турнір пасля некаторага перапынку паўднёвых суседзяў. Цікава будзе прасачыць за амбіцыямі кіеўскага „Сокала”, які мае ў сваім складзе досыць багата дасведчаных гульцоў, у тым ліку і зборнай Украіны. Абсалютны дэбютант 18-га першынства краіны — гэта „Шахцёр”. Фармальна гэта фарм-клуб мінскага „Дынама”, якое сярод сваіх не выступае, а будзе гуляць як і летась у Кантынентальнай Хакейнай Лізе. Але назваць салігорцаў навічкамі не павернецца язык. Хоць бы таму, што ў яго складзе сабраныя моцныя і спрактыкаваныя майстры — брамнік Сцяпан Гарачэўскіх, абаронец Андрэй Башко, форварды Дзмітрый Дудзік, Сяргей Задзялёнаў, Дзмітрый Мялешка, Яраслаў Чупрыс, якія нямала пагулялі і за нацыянальную дружыну.

У складзе „Гомеля” таксама шэраг вядомых хакеістаў — вундэркінд-галкіпер Ігар Брыкун, абаронец Уладзімір Копаць, нападнік Яўген Есавулаў. Крыху загадкавымі застаюцца жлобінскі „Металург” і магілёўскае „Хімвалакно”. Хіба больш слабым стане мінскі „Керамін”, хоць ён і выйшаў нядаўна ў фінал Кубка краіны. Напэўна, пастараюцца ў новым сезоне выступіць лепш „Брэст” і наваполацкі „Хімік”-СКА. Зрэшты, прагнозы — рэч няўдзячная.

Галоўным жа фаварытам зноў з’яўляецца сталічнае „Юнацтва”, галоўны трэнер якога Міхаіл Захараў пад час адпачынку косіць (у прамым сэнсе) разам з Вярхоўным Галоўнакамандуючым і не прывык саступаць нікому. Цікава, ці зможа зноў скласці належную канкурэнцыю „юнакам” „Гомель”, ці прадоўжыць прагрэсаваць „Нёман”? Прыкметна, што маем зараз 7-9 прыблізна роўных па класе і складзе камандаў. І тут шмат будзе залежаць ад трэнерскага майстэрства. Сама старэйшы ў настаўніцкім корпусе — кіеўлянін Аляксандар Сеўканд, сама малады — гарадзенец Дзмітрый Краўчанка.

Цэнтральным матчам першага тура стаў спабор мінулагодніх фіналістаў. Чэмпіён краіны „Юнацтва” зноў выявіла сваю перавагу над „Гомелем” — 3:1. З перамогі стартаваў і гарадзенскі „Нёман”, які з цяжкасцю адолеў жлобінцаў — 5:4. Экстраліга рушыла ў супольны шасцімесячны паход, які прывядзе да новай пары года — сакавіцкага плэй-офа.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

З дрэвамі — асцярожна!

Пішу гэтыя словы, каб перасцерагчы тых, якім здаецца — так як да нядаўна і мне — што яны з'яўляюцца гаспадарамі на сваім панадворку. Аказваецца — не, і гэта па некалькіх прычынах. Давайце прыпомнім клопаты з тэкстам надпісу на помніку праваслаўным ахвярам II сусветнай вайны, пакутнікам за веру і нацыянальнасць у 1939-1956 гг. Ва ўсім, падобна шматкультурным, Беластоку не знайшлося для яго месца, а калі была атрымана згода на ўсталяванне яго на прыцаркоўнай тэрыторыі, не сціхлі галасы крытыкі зместу мемарыяльнай дошкі.

Таксама не заўсёды можам рашаць аб тым, што будзе расці на нашым панадворку. Лакальны друк аднаго з цэнтральных ваяводстваў нядаўна пісаў пра клопаты жыхароў аднаго мястэчка, выкліканыя ссячэннем дрэў каля сваіх дамоў.

Часта здараецца што бесталкова нешта пасадзім пры доме, не думаючы аб тым, як гэты саджанец будзе выглядаць праз 30-40 гадоў. Так было ў выпадку спадара К. Чверць стагоддзя таму пасадзіў ён каля хаты елку — звычайную. Сёлета ссек яе па просьбе маці, паколькі дрэва зацямняла акно ейнага пакоя. Нехта „добразычлівы" данёс аб гэтым мясцовай адміністрацыі. Праз чатыры месяцы з'явіліся чыноўнікі, знайшлі пянёк — і неўзабаве з магістрата прыйшоў рахунак: за самавольную высечку пану К. трэба заплаціць 11 600 зл.! „Пашанцавала мне, — кажа пан К., — што гэта не была дэкаратыўная калючая елка, бо да канца жыцця трэба было б працаваць на штраф".

Намнога больш, бо амаль 100 тыс. зл. аштрафаваны іншыя жыхары гэтага мястэчка — браты М. Высеклі яны вербы і амерыканскі ясень, якія ўласнаручна пасадзілі сорак гадоў таму на вотчыне. Дрэвы ўжо спарахнелі і маглі б некаму нанесці шкоду падчас віхуры. Браты М. — пенсіянеры і ім не пад сілу заплаціць такі штраф. Пойдуць за краты!

На высечку кожнага дрэва неабходны дазвол. Гмінная адміністрацыя можа даць згоду, або і не, але збор заплаціць ім трэба. Таму многія рашаюцца пайсці лёгкім шляхам і абыходзяцца без непатрэбнай бюракратыі. Каб толькі ён бокам не вылез, як у згаданых выпадках!

М. Ц.

Няўжо разбагацелі?..

Сёлета фрукты абрадзілі. Дагэтуль я займаўся садочкам ды цяпліцай. Вядома, што сваё, гэта не з крамы. Карыстаюся дагэтуль прынцыпамі народнай мудрасці: „Што летам нагою, дык зімою рукою". Бо гэта праўда. Хоць у маёй кладоўцы шмат мінулагодніх запасаў (кансерваваных агуркоў, усялякага віду варэнняў, сокаў, сушаных яблык і грыбоў, але не дазваляю, каб свежыя псаваліся. (Праўда, марынаваныя грыбочкі кончыліся, але лічу, што яшчэ ў гэтым годзе пакарыстаюся дабрадзействамі лесу ды па грыбы буду хадзіць).

Калісьці, як людзі не мелі ўласных садоў, дык у наваколлі на палетках усе грушкі-дзічкі збіралі. Мяшкамі іх цягалі, затым „гнілкі" сушылі. Зімою кампот (шчолак) варылі. Памятаю, як у маладосці „ў арэнду" хадзілі (у чужы садок, значыцца, прабіраліся). Найбольшы агарод быў на „Ажарове" ў Сямёна Качука, таму і туды найбольш хадзілі. Гаспадар начамі ў будане на полі пільнаваў сад, але і мы яго пільнавалі. Няраз стрымгалоў уцякалі з яблыкамі ды грушамі за пазухай.

Цяпер фрукты нікому непатрэбныя. Амаль у кожнага на панадворку растуць свае дрэўцы ды невядома што рабіць з садавінай. Калісьці чалавек з Кляшчэль ездзіў на грузавой машыне ды апалыя яблыкі купляў. Плаціў па 10 грошаў за кілаграм. Людзі збіралі ляжачыя фрукты і прадавалі. У рыначнай эканоміцы гэты бізнес аказаўся слабым і скупка заняпала. Аж прыкра глядзець, як дабро марнуецца. На чаромхаўскіх тратуарах побач чыгуначнай станцыі людзі тапталі смакавітыя сліўкі-мірабэлькі ды грушы. Няўжо чаромхаўскае насельніцтва так „распанела", што няма ахвотнага пазбіраць фрукты? А мо, проста, сталі абібокамі і чакаюць манны нябеснай?

У заканчэнні прыгадаю фрагмент байкі Івана Крылова „Стрекоза и муравей": „Кумушка, мне странно это: Да работала ль ты в лето?"

(ус)

Шукаю каранёў...

Ад нейкага часу на старонках „Нівы" сустракаю допісы свайго аднафамільца Ігара Сідарука з Кобрына, што на Беларусі. Зараз, калі так хутка сцякае жыццё, прыйшла мне думка пацікавіцца мінулым, сваімі каранямі. Так складаецца, што радавод матулі якраз з Кобрына выводзіцца. Бацькамі яе былі Сцяпан Селях і Эмілія Кісялеўская. Бабуля (па маці) была каталічкай і выходзіла са шляхецкага роду. За мужам пайшла ў царкву, ды і шлюб там бралі. Дзетак у царкве хрысцілі. У мяне затым вялікая просьба да беларускага калегі: адкуль Сідарукі ў Кобрыне знайшліся? Хачу падказаць, што бацька мой з Дабрывады выходзіў, а аднафамільцаў у гэтай вёсцы шмат. Такія ж прозвішчы сустракаюцца ў Апацы, Саках каля Пасынак. Але мяне найбольш цікавіць Кобрын.

Лічу, што мой незнаёмы калега па пяру дапаможа разабрацца ў пошуках і неўзабаве адгукнецца на старонках „Нівы". Усё ж такі жывём не за гарамі...

Уладзімір СІДАРУК

Загулялі ў Ляўкове!

Пасля поўдня ў апошнюю летнюю жнівеньскую нядзелю па Старым Ляўкове і ваколіцы плылі прыгожыя і меладычныя папулярныя беларускія, украінскія і рускія песні. Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы і Прадпрыемства „Будаўнічая кераміка Ляўкова" арганізавалі ў тамашнім амфітэатры беларускі народны фэст і Свята керамікаў. Канцэрт вёў Марк Скамароўскі (ён вядзе і Цэнтр адукацыі „Інтэрнэтная вёска" ў былой школе ў Старым Ляўкове).

Выступіла семнаццаць калектываў з Беластока, Бельска-Падляшскага, Гарадка і Сямятыч ды два, якія дзейнічаюць у Нараўчанскай гміне. Усе яны адрэкамендавалі розныя музычныя гатункі. Сваім музычным майстэрствам заваражыла слухачоў бельская „Маланка". Яна і гарадоцкі „Асенні ліст" заспявалі дадактова па адной песні на „біс".

Надвор'е было ласкавае, сонечнае ды цёплае. Прыемна і весела было пасядзець (гмінныя ўлады паклапаціліся пра лавы для ўдзельнікаў канцэрта) і асалодзіць сабе вольны час мілагучнымі песнямі. Рэпертуар быў багаты. Хто хацеў, дык мог купіць сабе магнітафонныя касеты з запісамі мелодый.

Адбыліся два конкурсы: на найпрыгажэйшую скульптуру з гліны ды літаратурны — на найлепшую рэкламу ляўкоўскіх керамічных вырабаў — вершам. У першым конкурсе ўдзельнічалі перш-наперш дзеці і моладзь. Найлепшымі скульптарамі былі аб'яўлены: Рыгор Саковіч, Ева Саковіч і Кінга Кардаш (яны заваявалі I месца), Магда Стоцкая і Віктар Патонец (II месца) і Магда Кумэта (III месца). Адным з пераможцаў у літаратурным конкурсе стаў наш супрацоўнік і радны Янка Целушэцкі (заняў ён I месца), а на другім і трэцім месцы апынуліся Тадэвуш Кунцэвіч і Яўген Смольскі.

Вечарам пачаліся танцы пад гукі вакальна-інструментальнай групы „Тройка". Працягнуліся яны да поўначы. У Ляўкове добра загулялі!

(яц)

Адгаданка



1. градка для кветак у выглядзе замкнутай фігуры, 2. польская гербавая птушка, 3. белая вадкасць з грудных залоз самак млекакормячых, 4. вялікі сібірскі горад на Ангары, 5. сталіца Аўстрыі, 6. дзялянка высечанага лесу, 7. асоба, якая прад'яўляе іск, 8. буйная чалавекападобная малпа, 9. бяздомны чалавек, які не мае пэўнага прыстанішча і заняткаў, 10. Герберт фон, нямецкі дырыжор (1908-1989).

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — ірландская пагаворка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 32 нумара

Вага, вада, вата, чай, дырыжор, жах, склад, куль, міс, печ, цаля, цік.
Рашэнне: **Плач дажджавой хмары выклікае радасць квяцістага луга.**
Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Тэкст і фота
Ганны КАНДРАЦЮК

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі...

-3-

(пачатак у 35 н-ры)

Ялоўку можна апісаць адным сказам: найбольш жывым тут месцам з'яўляецца Дом для састарэлых. Я крыху здзівілася, калі разам са мной з аўтобуса, што прыехаў з Беластока, вылезлі два скінгеды. Масіўныя маладзёны, як пачаткова меркавала я ў сваёй наіўнасці, не пайшлі з візітам да сваіх дзядуляў у *Дом Старцаў*. Яны адразу накіраваліся ў самае магнітнае месца ў Ялоўцы, карацей, у магазін-бар „Міранд". Ісці іх следам было рызыкоўна, — я неразважна апранулася ў майку са знакам *пацыфы*...

Жнівеньская спёка ў спалучэнні з нерухомай цішынёй, буйнай, здзічэлай зеленню і паваленымі платамі, закалыхвала і наводзіла сон. У пэўны момант мне здалося, што я ў Дзісне на поўначы Беларусі. Параўнанне выклікалі руіны чырвоных касцёлаў, узарваных у апошнюю вайну і пакінутых нашчадкам як „рамантычны атракцыён". У Ялоўцы, як і ў Дзісне, чулася гістарычныя пласты пад нагамі ды тую нотку паніхіды па дагараючым жыцці. На Лясной вуліцы, дзе славутыя на ўсю гміну руіны неагатычнага касцёла св. Антонія, — так інфармуюць сайты — я не спаткала жывой душы. Неяк казачна выглядала і мураваная царква з агромністымі „залатымі" купаламі. І французскамоўныя турысты, якія прыперліся сюды на пяць хвілін сфатаграфаваць мясцінку, прыліплую да ўсходняй мяжы Еўрасаюза. Шмат часу я прагуляла ў гарадскім парку ля каралеўскага бюста, сярод скошанай канюшыны. У канцы канцоў, я адважылася зайсці ў „Міранд". Гміна Міхалова вельмі ж ганарыцца веласіпеднымі шляхамі. Адзін з іх пачынаўся побач маёй лаўкі, ля аўтобуснага прыпынку. Маршрут абяцаў завесці аж у Каралеўскі Мост (слаўны ў наш час з-за псеўдасвойскіх фільмаў *U Pana Boga za piecem, U Pana Boga w ogródku, U Pana Boga za miedzą*), мінаючы па дарозе: Мастаўляны, Свіслачаны, Габяты, Баброўнікі, Рудакі, Ласіняны, Крушыняны, Грыбаўцы, Гарадок, Каралёвае Стойла, Радулін, Залукі.

— Ці можна ў Ялоўцы пазычыць на пракат якісьці ровар? — спытала я ў маладзенькай прадаўшчыцы.

— Што? — пачула я ў адказ.

Адразу мяне паінфармавалі, як пяшком патрапіць у Мастаўляны:

— Выйсці з магазіна і проста *засуваць* шэсць кіламетраў...

— У які бок?

— Як у які? У той што дарога!

У вёсках ля ўсходняй мяжы Еўрасаюза амаль усе дарогі вядуць у адзін бок: на Захад. У Ялоўцы, распаложанай адзінаццаць кіламетраў ад Свіслачы, як нідзе, адчуваецца яшчэ адна лінія падзелу, — дзяржаўная мяжа. У нармальных абставінах мой маршрут павінен накіравацца менавіта ў Свіслач. Там, у славутай Свіслацкай гімназіі, у 1847-1852 гадах вучыўся Вікенцій Кастанцін Каліноўскі. На свіслацкім могільніку адноўлена магіла Віктара Каліноўскага, роднага брата і ідэйнага настаўніка кіраўніка Студзеньскага паўстання ў Беларусі. У беларускім мястэчку наткнемся яшчэ на бюст Кастуся, праўда, статуя ўпісаная ў паркава-помнікавую галерэю, разам з Рамуальдам Траўгутам, Язэпам Сталінам і расейскім імперскім арлом...

Магчыма, пад уплывам дрымоты і веласіпедных шляхоў Міхалоўскай гміны, мне „пабачыўся" і адукацыйна-турыстычны шлях у гонар Кастуся Каліноўскага; ён павінен весці з нашых Мастаўлян і завяршыцца прынамсі ў Гудзевічах на Мастоўшчыне, праз Ялоўку, Свіслач, Якушоўку... У Гудзевічах, у славутым музеі Алеся Белакоза, можна пабачыць дакументы і памяткі з жыцця змагара, разам прэзентуюцца літаратурныя і жывапісныя творы ў гонар змагара за свабоду і годнасць беларускага і польскага мужыка. Бо нягледзячы на ўсякае рознагалоссе вакол прозвішча рэвалюцыянера, ён — жывы ўзор для сучаснай моладзі. Год у год на магілу Віктара Каліноўскага цягнуць моладзевыя пілігрымкі з бел-чырвона-белымі сцягамі: з Гродзеншчыны, Брэстчыны, Міншчыны... Хоць менш-больш акрэсленае месца спачыну Вікенція Канстанціна (Гара Гедыміна ў Вільні), на сённяшні дзень няма ў яго магілы. Маладыя дзеячы БНФ знайшлі і на гэта спосаб. Яны, не чакаючы ніякай дапамогі, самі набралі зямлі з Гары Гедыміна і перапахавалі яе ў мясцовасці Плебань пад Мінскам! Акцыя праходзіла нядаўна, у кастрычніку мінулага года.

Яшчэ больш уразіла ідэя з нашага, здавалася б, мёртвага ў ідэйным плане, беластоцка-беларускага панадворка. Сёлетнія арганізатары рок-фестывалю „Басовішча" намерыліся друкаваць фестывальную газетку-лістоўку на ўзор „Мужыцкай праўды"...

(працяг будзе)

12.09 — 18.09

(22.03. — 20.04.) 14 — 18.09. — вырашыш некалькі ключавых спраў, дагаворышся з людзьмі. Будзеш рашучы, але і гнуткі. З 17.09. (да 21.09.) — прафесійныя абавязкі будуць калідаваць з сямейным жыццём; можаш не справіцца ў рабоце. Калі ты не гатовы, нічога не прыспешвай.

(21.04. — 21.05.) 12 — 16.09. будзеш распамятваць няздзейсненыя надзеі, страты і паразы. Калі хтось цябе скрытыкуе, можаш яму гэтага не дараваць. 13 — 17.09. будзеш ласы на кампліменты і абяцанні; можаш лёгка стаць ахвярай маніпуляцыі. 15 — 19.09. будзь вельмі асцярожны ў час падарожжаў, асабліва службовых.

(22.05. — 22.06.) З 15.09. (да 19.09.) праблемы ў фінансах і з законам. Некаторыя могуць выкарыстаць сваю перавагу над табой. Не дазволь, каб цябе да чагосьці прымусілі. Не варта парываць знаёмства, усё можа паладзіцца.

(23.06. — 23.07.) У час маладзіка Месяца (18.09.) можаш наладзіць знаёмствы, якія прынясуць табе многа карысці. Узірайся на асобы са знака Дзевы, Быка або Льва. Да 13.09. асоба, з якой маеш хісткія лады, можа змяніць фронт. Не пашкадуеш грошай на распешчванне блізкіх.

(24.07. — 23.08.) 12 — 14.09. убачыш перад сабой новыя фінансавыя магчымасці. Засяродзься на найважнейшым. 15 — 19.09. лёс можа паблытаць твае планы; можа не ўдацца тое, на што найбольш разлічваеш. Рассакрэціш інтрыгана на працы.

(24.08. — 23.09.) 12 — 13.09. справішся з рознымі перашкодамі. 15 — 19.09. — твая брутальная шчырасць будзе не зусім на месцы; непатрэбна параніш кагосьці. Будзеш недаверлівы. Парайся ў неканвенцыянальных лекараў.

(24.09. — 23.10.) 12 — 13.09. пільнуйся, каб не падысці пад дурнога хату. Можаш страціць шмат з-за сваіх ляноты і павольнасці. Не пераймайся тым, на што не маеш уплыву.

(24.10. — 22.11.) Будзе табе цяпер лягчэй, засяродзься на самым важным. 12 — 13.09. пазбягай важных сустрэч, не абяцай сабе зашмат і не будзь зайздросны. 15 — 19.09. — фатальны час на падпісванне дакументаў. З-за сваёй блізарукасці можаш многа страціць.

(23.11. — 22.12.) 12 — 13.09. хтосьці можа паказаць табе дзе зімуюць ракі! 14 — 18.09. — гарантаваныя поспехі на працы, у інтарэсах, кан'юнктура ў фінансах. Можаш разлічваць на сяброў.

(23.12. — 20.01.) Абдумай, што для цябе найважнейшае. 15 — 19.09. — будзеш адчуваць сябе молада, прамяніста, будзеш мець сілу і харызму; людзі будуць браць цябе за ўзор. 12 — 18.09. не бярыся за стратэгічныя вырашэнні; не плануй важных падарожжаў і не вядзі размоў, ад якіх будзе залежаць твая будучыня.

(21.01. — 19.02.) 14 — 18.09. дасканала будзе ўсё ісці на працы. Адкрыешся на новыя магчымасці і не будзеш марнаваць часу. 12 — 18.09. прадбачваюцца цяжкія здарэнні, з якіх канчаткова выйдзеш цэлым. 15 — 19.09. будзь цярплівым і не плануй рэалізацыі мэт, якіх не ў змозе дасягнуць.

(20.02. — 21.03.) 15 — 19.09. добра складуцца рэляцыі са старэйшымі асобамі — атрымаеш ад іх значную дапамогу. Удадуцца мерапрыемствы планаваныя на доўгі час. 13 — 17.09. — благі настрой і стома ад знатужання; не бяры на сябе зашмат. Дні поўныя сюрпрызаў: 12 — 15.09.; лішняя мітуслівасць і схільнасць да экстравагантнасці могуць падвяргнуць цябе непрыемнасцям.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960